БАСКЕТБОЛ НІКОЛІ МЯНЕ НЕ ПЕРАСТАНЕ ЛЮБІЦЬ

ЧЫРВОНКА

ГАЛОЎНАЕ – НЕ ЎПУСКАЦЬ ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

13 КРАСАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 70 (29950)

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:

«Пытаннямі тэрытарыяльнай абароны ў Беларусі пачалі займацца не ўчора. Мы разумеем, што гэта важны складнік ваеннай бяспекі. Арганізацыя тэрытарыяльнай абароны пачалася з двухтысячных гадоў, і з таго часу былі адпрацаваны ўсе пытанні арганізацыі, планавання і ўдасканалення тэрытарыяльнай абароны. Па нашым шляху пайшлі і суседнія краіны. Польшча, краіны Прыбалтыкі зразумелі, што тэрытарыяльная абарона — неабходны элемент абароны дзяржавы».

РОБАТ УЛАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Фота Віктара ІВАНЬКАВА.

У Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку два дні праходзіў заключны этап рэспубліканскага конкурсу па асновах прафесійнай падрыхтоўкі сярод навучэнцаў Hi Tech.

На фінал у сталіцу з'ехаліся семдзесят маладых умельцаў ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў з усіх рэгіёнаў краіны. Пераможцы папярэдніх этапаў спаборнічалі ў намінацыях: «Мабільная робататэхніка», «Графічны дызайн», «Прататыпаванне», «Інжынерны дызайн», «Тэхналогіі беспілотных лятальных апаратаў», «Электроніка», «Вэб-тэхналогіі».

Шаснаццацігадовы Герман САРОКІН (*на фота*), вучань 6-й школы г. Віцебска, займаецца мабільнай робататэхнікай з шостага класа. У хлопца ўжо нямала поспехаў — так, некалькі гадоў таму ён станавіўся першым у сваёй намінацыі. Пераможцаў сёлетняга конкурсу ўзнагародзяць сёння. Магчыма, нашаму герою ўдасца паўтарыць уласнае дасягненне.

КАРАТКА

- **Беларусь і Пакістан абмеркавалі пашырэнне супрацоўніцтва паміж інстытутамі стратэгічных даследаванняў.**
- У Будапешце праходзіць сустрэча міністраў замежных спраў Беларусі і Венгрыі.
- **Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет плануецца правесці 24-25 мая ў Маскве.**
- З 1 мая пенсіянерам дадуць зніжку на праезд у электрычках.

- **Па праграме «Сямейны капітал» адкрыта больш за 125 тыс. дэпазітаў.**
- «Нёман» прыме «Металург» у першым матчы фіналу Кубка Прэзідэнта.

ISSN 1990 — 763X

Компас

Традыцыйны і прамысловы, экалагічны, водны і глэмпінг

Усе віды адпачынку можна прымераць на сабе на тэматычнай выставе

Новыя маршруты ў Расіі, туры ў Грузію або на Кубу, водны, экалагічны ці прамысловы турызм у Беларусі — на старце новага турыстычнага сезона даведацца ўсе навінкі, магчымасці айчыннага адпачынку альбо падабраць паездку за мяжу можна на 25-й выставе-кірмашы «Адпачынак-2023», якая адкрылася сёння ў сталічным Палацы спорту.

СТАР. 3

Спецыяльны рэпартаж

ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Сяўба набрала тэмп

У календары людзей, занятых сельскагаспадарчай працай, гэтыя красавіцкія дні не менш, а, можа быць, нават больш адказныя, чым гарачая пара жніва. На палях стаіць гул трактароў, працуюць сеялкі. У Беларусі раннія яравыя пасеяны больш як на 28,1 працэнта плошчаў, і з кожным днём колькасць засеяных палеткаў расце.

СТАР. 4

У фармаце дыялогу

Умець не толькі лятаць, але і думаць

Ігар Сергеенка правёў сустрэчу з курсантамі і выкладчыкамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі

У сваім выступленні кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА асноўны акцэнт зрабіў на тэзісах, якія прагучалі ў Пасланні Прэзідэнта народу і парламенту. Галоўны з іх — захаванне незалежнасці і гатоўнасць дзяржавы, грамадства яе абараняць.

Фота БелТА.

Паводле слоў Ігара Сергеенкі, абстаноўка па перыметры граніц Беларусі застаецца складанай. Працягваецца мілітарызацыя рэгіёна, захоўваюцца спробы ўнесці раскол у беларускае грамадства. «Мы бачым, што фашызм канчаткова не пераможаны», — адзначыў Ігар Сергеенка.

Ён прывёў такія лічбы: за вызваленне Польшчы ў вайну загінула больш за 600 тысяч савецкіх салдат, яшчэ 400 тысяч — за вызваленне Прыбалтыкі. «Мільён загінулых там, дзе дзясяткамі, сотнямі зносяцца помнікі!» — звярнуў увагу Ігар Сергеенка.

Супрацьстаяць гэтаму, на думку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, Беларусь можа, захоўваючы памяць аб тых падзеях, народнае адзінства.

Таксама Ігар Сергеенка праінфармаваў прысутных аб частых правакацыях з боку суседніх дзяржаў, аб дамоўленасці з Расіяй аб размяшчэнні ў Беларусі тактычнай ядзернай зброі, аб мерах супрацьдзеяння санкцыям, фэйкам.

«Захад нарошчвае намаганні па фарміраванні аднапалярнага свету, актыўна душачы іншадумства і заахвочваючы русафобскія погляды, — адзначыў Ігар Сергеенка. — Захад не адмовіўся ад спроб дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне рознымі спосабамі, у тым ліку шляхам закідвання розных дыверсійных, тэрарыстычных груп».

У такім няпростым становішчы ў нашай краіне распрацоўваецца абноўленая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі. «Гэтая ідэя з'явілася не раптоўна. З'явіліся новыя рызыкі, выклікі, пагрозы сусветнага маштабу. Неабходна было ўносіць карэктывы з часу выдання той канцэпцыі, па якой мы цяпер працуем і жывём», — растлумачыў Ігар Сергеенка.

Паводле яго слоў, Канцэпцыя — дастаткова складаны дакумент. Напярадзе вялікая работа, каб на працягу года арганізаваць яе шырокае абмеркаванне. «Упэўнены, што налета, калі пачне працаваць Усебеларускі народны сход, дадзенае пытанне будзе вынесена адным з першых, каб зацвердзіць Канцэпцыю», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка таксама адказаў на пытанні курсантаў акадэміі. У прыватнасці, была закранута тэма патрыятызму. Па словах Ігара Сергеенкі, з улікам апошніх падзей яна знайшла адлюстраванне і ў новай рэдакцыі Канстытуцыі. «Як я разумею — гэта любоў да Радзімы: сваёй краіны, малой радзімы, сям'і, і бескарыслівае служэнне. Выхоўваць трэба з маленькага ўзросту на асабістым прыкладзе: сваімі ўчынкамі, паводзінамі, адносінамі да старэйшых, да памятных мясцін, святыняў», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Яшчэ адзін важны напрамак у патрыятычным выхаванні — захаванне гістарычнай памяці, але тут галоўнае — не колькасць мерапрыемстваў, а іх эфектыўнасць. «На пытанне, як выхаваць патрыёта, я адказаў бы так: і словам, і справай», — сказаў Ігар Сергеенка.

Таксама юнакоў цікавілі маладзёжная палітыка, якая праводзіцца ў дзяржаве, замацаванне маладых спецыялістаў на рабочых месцах, развіццё рэгіёнаў.

Курсанты ініцыявалі заснаванне асаблівай даты — Дня памяці герояў Беларусі. Ігар Сергеенка падзякаваў моладзі за ініцыятыву і паабяцаў вывучыць прапанову.

Паводле БелТА.

Найлепшы падарунак да прыгожай даты

Палац Незалежнасці наведалі прадстаўнікі Беларускага фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама»

Экскурсія па рэзідэнцыі Прэзідэнта Беларусі стала найлепшым падарункам для супрацоўнікаў і трэнераў таварыства, якое 18 красавіка адзначыць стагоддзе з дня заснавання. Знаёмства з ключавой пляцоўкай краіны, дзе прымаюцца найважнейшыя дзяржаўныя рашэнні, з атмасферай і абстаноўкай многіх зал, створаных таленавітымі беларускімі спецыялістамі і майстрамі, стала адной з найбольш запамінальных падзей для амаль сотні выкладчыкаў і супрацоўнікаў дзіцячых юнацка-спартыўных школ з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Як падзяліўся **старшыня цэнтральнага савета Беларускага фізкультурна-спартыўнага таварыства «Дынама» Ігар АБЯРЭМКА,** яны свядома хацелі сабраць усіх сваіх прадстаўнікоў напярэдадні такога сур'ёзнага свята як стагоддзе стварэння рэспубліканскага таварыства «Дынама». «Хацелася паказаць, дзе прымаюцца ключавыя рашэнні, звязаныя з развіццём нашага грамадства і дзяржавы, — заўважыў Ігар Абярэмка. — Не сакрэт, што кіраўнік дзяржавы ўдзяляе вялікую ўвагу спорту. Невыпадкова спорт у нашай краіне дынамічна развіваецца, ён жыве. Маючы такую падтрымку, мы прынясём нямала вялікіх спартыўных вынікаў у будучыні».

Старшыня цэнтральнага савета БФСТ «Дынама» застаўся пад уражаннем ад наведвання Палаца Незалежнасці. «Гэта набытак усяго нашага грамадства, беларускага народа, — перакананы ён. — Палац сведчыць аб тым, якія мы, беларусы, працавітыя, як мы цэнім тое, што ёсць у нашай краіне, і як мы гэта ўсё захоўваем. Мае супрацоўнікі яшчэ раз пераканаліся ў тым, што нам ёсць за што стаяць, ёсць за што змагацца, на чым выхоўваць наша будучае пакаленне і нашых спартсменаў. У нас вельмі шмат таленавітых хлопцаў і дзяўчат, думаю, яны яшчэ праявяць сябе на сусветных арэнах».

— Я ўпершыню ў Палацы Незалежнасці, таму эмоцыі, якія адчуваю, — непередавальныя, — адзначыў **намеснік старшыні Гродзенскай абласной арганізацыйнай структуры «Дынама» Яўген ДУДКО.** — Гэта знакавае, культавае месца, дзе прымаюцца важныя рашэнні не толькі для дзяржавы, а і ўсяго свету. Мы ведаем, што менавіта тут кіраўнік дзяржавы змог усіх аб'яднаць, каб былі прыняты правільныя рашэнні (у лютым 2015 года ў Палацы Незалежнасці адбылася сустрэча «нармандскай чацвёркі», якая паўплывала на ўрэгуляванне ўкраінскага крызісу. — **«Зв.»**).

Па словах **вядучага спецыяліста вучэбна-спартыўнага аддзела «Дынама» Юліі ЛАСОЎСКАЙ,** магчымасць наведаць рэзідэнцыю Прэзідэнта Беларусі з'яўляецца падарункам для супрацоўнікаў таварыства. «Палац Незалежнасці — гэта твор мастацтва, — лічыць яна. — Кожная зала, кожны куточак гэтага будынка напоўненыя ўтульнасцю, адметнай атмасферай. Такое адчуванне, што ходзіш па музеі. Мне здаецца, вельмі важна наведваць такія месцы нашай моладзі: тут — гісторыя нашай суверэннай дзяржавы».

Дырэктар Мінскай спецыялізаванай дзіцячаюнацкай школы алімпійскага рэзерву № 4 Ганна БЯКЕТАВА падзялілася, што яе ў Палацы Незалежнасці ўразіла літаральна ўсё. «Адчуваеш гонар, неверагодную асалоду, эстэтычнае задавальненне ад таго, што краіна мае такі шыкоўны Палац, — сказала ўдзельніца экскурсіі. — Адна справа, калі ты бачыш тое па тэлебачанні, іншая — калі на свае вочы можаш паглядзець, дзе адбываліся важныя гістарычныя падзеі. Аб гэтым я абавязкова раскажу сваім выхаванцам. Скажу ім і аб тым, наколькі ганарова прысутнічаць у Палацы Незалежнасці, у тым ліку ў зале ўручэння дзяржаўных узнагарод. Атрымаць высокую ўзнагароду з рук кіраўніка дзяржавы — найвялікшае шчасце. Дзеля гэтага, як я заўсёды кажу сваім дзецям, патрэбна вельмі шмат працаваць. Наколькі яны будуць любіць сваю справу, наколькі будуць імкнуцца да вышэйшых мэт, настолькі ганарова будзе прымаць краіна ўсе іх дасягненні».

Вераніка КАНЮТА.

Па сутнасці

ЯДЗЕРНЫ ДЗІВАСІЛ

Наша палітыка душэўная. Па-беларуску кажучы — людская. Чаму? Таму што мы ніколі не былі захопнікамі. Мы ніколі не дыктавалі ўмовы існавання для іншых. Хоць адна з протаканстытуцый Еўропы, а тады лічылася — і ўсяго свету, народжана на нашых землях. Гэта быў падмурак для новай эпохі ў заканадаўстве. Так, мы больш прывыклі будаваць. Замест букінгемаў вымушаныя былі ўзводзіць замкі. Чаму? Адказ у публіцыстыцы Каратквеіча. «Археолагі выкапалі ў скарбе другога стагоддзя наканечнік дзіды з рунічным надпісам: «Наперад!» А на такім жа наканечніку чацвёртага стагоддзя тыя ж вуглаватыя суровыя руны: «Назад!» Словы тыя ў нарысе пра Брэст — заходнія вароты нашай краіны. Раней вароты СССР. Цяпер — Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС. А палітыка Прэзідэнта была накіравана на тое, каб гэта быў мост супрацоўніцтва паміж Лісабонам і Уладзівастокам. Такая міралюбівая прапанова не падабаецца заходнім суседзям. Дарэчы, як і не падабалася раней. Таму нашы продкі вымушаныя былі ўзводзіць замкі. Таму Брэст быў вымушаны быць яшчэ і брамай. Брамай неўміручасці. Горадам-крэпасцю.

Дарэчы, менавіта на захадзе і паўночным захадзе нашай краіны — помнікі абарончага дойлідства. З Камянецкай вежы раней углядаліся ў цемру невядомасці — крыжакі альбо хто яшчэ. Сёння можна любавацца зялёнымі шатамі Белавежы — самага старадаўняга лесу Еўропы. Беларусы захавалі цнатлівасць свайго лесу. А вось Варшава... Экскаватары растапталі лясное покрыва запаведнага прыроднага масіву, а польскія ўлады — усе экалагічныя статуты і артыкулы, увесь экалагічны сэнс Еўропы.

Мы займаліся вынаходніцтвам не гармат. А да абароны прыстасоўвалі ўвесь быт. Яшчэ адна акалічнасць — цэрквы-крэпасці. Нават маліцца нашым продкам спакойна не давалі. Чарнаўчыцы, Сынкавічы. А колькі яшчэ такіх храмаў было. Кіраўнік Хатынскага мемарыяла хутка прывядзе да прытомнасці тых, хто верыць у танны еўрапейскі крэдыт і дэмакратычную натуру заходніх бенефіцыяраў. Захопнікі адтуль любілі паліць нашых продкаў у... цэрквах. Так адразу два пытанні вырашалі. Жыццёвая прастора і знішчэнне ментальнасці, нацыянальнага кода народа. Засталася каменная царква-крэпасць толькі ў Сынкавічах. У Чарнаўчыцах храм знішчылі крыжаносцы. Рыцары жалезных крыжоў і нацысцкай ідэалогіі. А колькі яшчэ такіх святых брам не захавалася... І вы цяпер ведаеце, чаму. Вось такая гісторыя станаўлення, наш шлях да Беларусі. Да суверэнітэту. Да сваёй аформленай па ўсіх правілах міжнароднага права дзяржаўнасці.

Але аказваецца, няма яго, гэтага права. Мы верылі ў светлыя намеры пасланцаў Белага дома і Рэйхстага. Верылі Будапешцкаму мемарандуму. Верылі ўсмешкам Пампеа і функцыянерам ПАСЕ. Яны ўсміхаліся, моцна паціскалі рукі нашым палітыкам і тым часам набліжалі да нашых граніц новую ўзброеную групоўку. Дарэчы, я не памятаю, каб у перыяды збліжэння з Захадам да нас прыязджалі англічане альбо палякі. Ну, з першымі ўсё зразумела — вельмі фанабэрыстыя. А палітыкі суседняй краіны чаму? Сумленне не пускала. Беларусь у зоне інтарэсаў. І на картах польскіх нацыяналістаў у межах «жэчы паспалітай». Ніяк смагу амбіцый «ад можа да можа» не спатоляць. А як паслухаеш іх генералаў, даведаешся аб планах пра набыццё новага ўзбраення, дарэчы, наступальнага. Аж да чатырох працэнтаў ВУП гатовыя ўкладаць у мілітарызацыю краіны. Такой шчодрасці няма нават у сенатараў ЗША для Пентагона.

І вось ва ўсіх гэтых умовах мы што, павінны сядзець склаўшы рукі? Чакаць, пакуль разбурацъ нашы хаты да ўзроўню зямлянак, чакаць, пакуль ізноў кожнага трэцяга знішчаць? Пакуль ізноў загоняць нас у хатынскі хлеў?

Эмацыянальна? Добра, цяпер факты. Альянс НАТА афіцыйна быў створаны ў процівагу Варшаўскаму сацыялістычнаму блоку. Няма больш таго. А ружа паўночнаатлантычных вятроў працягвае рухацца на ўсход. Панаванне аднаго ветру ў прыродзе ніколі не прывядзе да кліматычнага дабрабыту. А ў геапалітычным клімаце — тым больш.

Беларусь была краінай замкаў. А цяпер краіна мемарыялаў. Замкі, таму што былі вымушаныя абараняцца. Мемарыялы — у гонар загінулых падчас барацьбы з акупантамі. Але нам больш даспадобы будаваць дзіцячыя садкі і школы, жыллё і месцы для адпачынку. Мы жадаем сеяць хлеб. І спяваць песні. Каб палі пераворвалі гусеніцы трактароў, а не танкаў. Мы за меліярацыю, а не мілітарызацыю.

Таму толькі сапраўды бацька мог прапанаваць даць бой зброі — знішчыць. Ну... Чакаем. Рэакцыя наконт вяртання ядзернага патэнцыялу ў Беларусь была імгненнай. Пра бяззбройную Еўропу — быццам бы не пачулі. Калі нават фанабэрыстыя брытанцы заявілі: вайна да апошняга — чалавека. Кажуць — чалавека, маюць на ўвазе — украінца. Вы — «дэмакраты апошняй гільдыі» — у бацькоў з Валыні спыталі, ці згодныя яны ваяваць? Ну і як нам паводзіць сябе пры такім раскладзе? Толькі вяртаць зброю, якую вывелі калісьці пад гарантыі бяспекі, ваеннай і эканамічнай. Нічога з гэтых гарантый не выканана. Таму вяртаемся да нулявых настроек. Тым больш што мы нічога не выдумлялі. Расія пачынае паводзіць сябе люстэркава. Як ЗША, напрыклад. Ну, нарэшце. Для нас гэта магчымасць застацца людзьмі ў незалежнай краіне. Цяпер замест «шэрай зоны» — тэрыторыя ядзернага тактычнага стрымлівання.

Дарэчы, на ўмацаванні нашай абараназдольнасці англаксы пабудавалі сваю чарговую інфармацыйную кампанію. Па-першае, каб напалохаць свой электарат. Абгрунтаваць новыя падаткі, адцягнуць увагу ад пенсіённага генацыду, ды мала яшчэ ад якіх спраў. Там хапае хібаў. Па-другое, настроіць нас супраць сваіх жа ўлад і жыццёва неабходных рашэнняў.

Спецыяльна мусоляць тэму ды дзеясловы. Ці вяртаецца зброя, ці то яна размяшчаецца. Карацей. Цяпер беларускія вайскоўцы праходзяць курсы павышэння кваліфікацыі. Каб ведаць, як аператыўна і прафесійна расчыніць ядзерны парасон бяспекі. Каб і надалей Белавежа захавала сваю цнатлівасць, краіна — незалежнасць, магчымасць есці свой самы смачны хлеб, патрэбен гэты ядзерны аргумент стрымлівання. Мы ж павінны захаваць сябе ў гісторыі. І нават саму Еўропу, хоць бы ў межах Беларусі, бо краіны Старога Свету паводзяць сябе так, нібыта крочаць да самаліквідацыі. Нават у культурным і дэмаграфічным плане.

Наша палітыка душэўная. Па-беларуску кажучы — людская. У палескай дрыгве расце дзівасіл. Кветка, што лечыць ад мноства хвароб. Ядзерны дзівасіл — прафілактыка ад мноства выклікаў. Тут дарэчы і коласаўскія радкі прывесці, укладзеныя ў вусны няскоранага дзеда Талаша: «Не мы гэта пачыналі».

Яўген ПУСТАВОЙ.

Рэха вайны

«МЫ ПАВІННЫ ГЭТА ПОМНІЦЬ»

У медыяцэнтры Віцебскай вобласці прайшоў адкрыты анлайн-урок «Жахі Вялікай Айчыннай вайны ніколі не павінны паўтарыцца»

На сувязі са студэнтамі гістарычнага факультэта ВДУ, віцебскімі школьнікамі і членамі краязнаўчага клуба «Дзвіна» Віцебскага кадэцкага вучылішча былі пракурор Віцебскай вобласці Ігар Украінец, кіраўнік атрада «Пошук» Ларыса Бруева, настаўнік гісторыі ВКВ Мікалай Півавар, малалетні вязень канцлагера «5-ы полк» Софія Шлыкава, кандыдат гістарычных навук Алеся Корсак, гісторыкі і пошукавікі.

У красавіку 2021 года была распачата крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «За два гады ў краіне было дапытана каля 16 тысяч чалавек, 2500 — толькі ў Віцебскай вобласці. Сярод іх больш за палову — вязні лагераў смерці, іх сваякі, іншыя сведкі і відавочцы злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і калабарацыяністаў. Большасць допытаў запісана на відэа, гэтая інфармацыя неацэнная. Для крымінальнага працэсу яна з'яўляецца фундаментальным доказам факта генацыду нашага народа, бо відэазапісы допытаў не пакідаюць сумненняў нават у скептыкаў і праціўнікаў, якія спрабуюць перапісаць гісторыю адносна гістарычнай праўды пра тыя трагічныя падзеі, якія адбываліся ў гады вайны на нашай зямлі», — распавёў пракурор Віцебскай вобласці Ігар Украінец.

На тэрыторыі паўночнага рэгіёна ў гады вайны дзейнічала звыш ста месцаў прымусовага ўтрымання мірных жыхароў і ваеннапалонных — фактычна лагераў смерці. Мала хто ведае, але ў вобласці карнікамі было праведзена не менш за 46 карных аперацый, у выніку чаго фашысты знішчылі 4200 населеных пунктаў. Многія з іх ніколі больш не ўзнялі ся з попелу... Падчас расследавання крымінальнай справы было ўстаноўлена 26 населеных пунктаў на Віцебшчыне, якія паўтарылі вогненны лёс Хатыні. За два гады было знойдзена 67 да гэтага невядомых месцаў масавых пахаванняў.

«Галоўнай мэтай расследавання па факце генацыду беларускага народа з'яўляецца ўвекавечанне памяці ахвяр вайны. Мы павінны гэта помніць. Нягледзячы на тое, што афіцыйна крымінальная справа была распачата ў 2021 годзе, пошукавая работа вялася бесперапынна заўсёды. Ніколі не позна ўстанавіць ісціну», — падкрэсліў Ігар Уладзіміравіч.

Балючую рану на сэрцы ўсяго яўрэйскага народа пакінула Віцебскае гета. Менш чым за паўгода тут загінула каля 20 тысяч чалавек. 25 ліпеня 1941 года ўсім яўрэям Віцебска было загадана сабрацца з асабістымі рэчамі для перапраўкі праз Дзвіну ў зону гета. Моста не было, а пантонны, які пабудавалі немцы, выкарыстоўваць не дазвалялася. Фашысты наўмысна перакульвалі лодкі і платы з людзьмі, многія, асабліва дзеці і старыя, патанулі. Тых, хто хацеў схапіцца за жыццё, дабівалі вёсламі і расстрэльвалі. Толькі падчас пераправы загінула каля 2000 чалавек. Умовы ў гета былі невыносныя: яўрэі жылі на руінах разбураных будынкаў, ладзілі шалашы, харчавання не было. У кастрычніку людзі пачалі гінуць па 20-30 чалавек на дзень ад голаду, а эпідэмія, якая пачалася з надыходам халадоў, падштурхнула фашыстаў масава знішчаць хворых: за некалькі дзён у лістападзе 1941-га карнікі расстралялі каля пяці тысяч чалавек. Катаванні былі неймаверныя: дзяўчат і жанчын «стэрылізавалі», яны масава паміралі ад болю і заражэння крыві. «У снежні пачалі ліквідацыю гета, яўрэяў штодзённа па 200-300 чалавек вывозілі да Ілаўскага рова, прымушалі распранацца дагала і расстрэльвалі. Дзяцей жывымі скідвалі ў яму, магіла «дыхала» і варушылася. Зверху немцы праязджалі грузавікамі. 19 снежня 1941 года было абвешчана аб поўнай ліквідацыі Віцебскага гета. Паводле афіцыйных данных, за пяць месяцаў там загінулі 20 тысяч чалавек, 9 тысяч з якіх — дзеці», — расказаў гісторык Арцемій Васілевіч.

Софія Аляксандраўна Шлыкава трапіла ў канцлагер «5-ы полк», калі ёй было два гады. У сям'і выхоўвалася яшчэ чацвёра дзяцей, бацька загінуў на Калінінскім фронце, старэйшы брат пайшоў у партызанскі атрад, які арганізаваў Мінай Шмыроў на Суражчыне. Маці і астатніх дзяцей немцы выгналі ў лагер, дзе яшчэ не было баракаў, — жылі ў стайнях. Потым, акрамя мірнага насельніцтва, у «5-ы полк» пачалі прывозіць ваеннапалонных. Голад, холад, цяжкая праца на чыгунцы, касіў людзей тыф. Нават прыбіральню немцы зрабілі так, каб палонных гінула больш: то была жэрдка над рачулкай. Хто не мог на ёй утрымацца — тануў, на паверхні заставаліся толькі валасы... На тэрыторыі лагера людзі самі хавалі памерлых і забітых. Па афіцыйных звестках, у перыяд з верасня 1941-га да мая 1944 года ў лагеры загінула ад 80 да 100 тысяч чалавек, ён з'яўляецца другім па велічыні пасля Асвенцыма.

Вучні Ржаўскага дзіцячага сада-базавай школы Бешанковіцкага раёна падзяліліся вынікамі сваёй работы па ўвекавечанні памяці ахвяр вайны. Так, школьнікі сумесна з раённай пракуратурай увасабляюць у жыццё праект «Памяць пакаленняў» — гэта інтэрактыўная карта, на якую занесена інфармацыя аб ахвярах генацыду і адзначаны спаленыя на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна вёскі. Дзевяцікласніца Юлія Аршанская з сярэдняй школы № 15 Віцебска прэзентавала школьны музей, у фондах якога знаходзяцца 500 экспанатаў-сведкаў ваеннага ліхалецця. «Залы ў музеі тэматычна падзелены: пачатак вайны, горад пад акупацыяй, вызваленне. Мы праводзім экскурсіі, пішам даследчыя работы. Сёння дадзеная тэма як ніколі актуальная», — падкрэсліла школьніца.

Сёлета на тэрыторыі Віцебскай вобласці запланаваны палявыя пошукавыя работы на шасці раней невядомых пахаваннях: два з іх размешчаны ў Сенненскім, астатнія — у Лёзненскім, Глыбоцкім і Шаркаўшчынскім раёнах.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Традыцыйны і прамысловы, экалагічны, водны і глэмпінг

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета яна сабрала рэкордную за апошнія гады колькасць удзельнікаў — больш за 300. І праходзіць ва ўнікальным на сёння фармаце. У адрозненне ад стандартных выставачных мерапрыемстваў тут маецца некалькі лакацый: традыцыйная, дзе ўсе экспаненты прадстаўляюць свае прадукты, пляцоўка за Палацам спорту для фуд-кортаў і фуд-тракаў, а ў акваторыі Свіслачы прадстаўлены водны турызм. Акрамя таго, прадугледжана вялікая дзелавая праграма.

Беларускія ўдзельнікі прадстаўляюць усе без выключэння рэгіёны. Акрамя іх у дзелавых і выставачных мерапрыемствах удзельнічае больш за 40 суб'ектаў Расіі. З далёкіх рэгіёнаў прыбылі кіраўнікі сферы турызму — міністры або старшыні камітэтаў па турызме і культуры. Самыя маштабныя і цікавыя прапановы падрыхтавалі Ніжагародская вобласць, Санкт-Пецярбург, Карэлія, Кузбас, Калінінград, Краснадарскі край. У рамках выставы прэзентуюцца і сумесныя беларускія праекты з рэгіёнамі Расіі, новыя маршруты і прадукты. Амаль усе краіны СНД прадстаўлены на прэзентацыйнай пляцоўцы. Акрамя Беларусі і Расіі, на выставе свае турыстычныя прадукты дэманструюць Грузія, Узбекістан, Пакістан, Балгарыя, Венесуэла і Куба.

Адзін з цікавых кірункаў выстаўкі — прамысловы турызм. Свае прапановы прэзентуюць такія прадпрыемствы, як «Граніт», Мінскі трактарны завод, БелАЗ, «Лідскае піва». Таксама шырока прадстаўлены беларускія здраўніцы і аграсядзібы, медыцынскія і СПА-цэнтры, загарадныя комплексы, паляўнічыя і рыбалоўныя гаспадаркі. Упершыню ў рамках выстаўкі пройдзе прэзентацыя глэмпінгу — люкс-адпачынку пад адкрытым небам.

— Такі кірунак, як аграэкатурызм, стаў пэўнай візітоўкай нашай краіны, — кажа **намеснік міністра спорту і турызму Алег АНДРЭЙЧЫК.** — Сёння ў краіне працуе больш за тры тысячы аграсядзіб, дзе летась адпачыла амаль паўмільёна чалавек. Госці з Расіі актыўна праяўляюць цікавасць да такога адпачынку, таму гэта вельмі перспектыўны кірунак, які шырока прадстаўлены на выставе.

Тут можна падабраць паездку з турыстычнай кампаніяй, тур на аграсядзібу, набыць пуцёўку ў санаторый, а таксама паўдзельнічаць у розных актыўнасцях на адкрытай пляцоўцы, у тым ліку конкурсах, віктарынах, розыгрышах тураў і картак зніжак. На пляцоўцы фуд-кортаў за Палацам спорту пройдуць спаборніцтвы паміж шэф-кухарамі Мінска, Масквы і Ніжняга Ноўгарада — некаторыя з іх, між іншым, адзначаны зоркамі Мішлен. А 12 і 13 красавіка ў 10, 13, і 16 гадзін шэф-кухары прапануюць па 50 раздач наведвальнікам выставы, дзе кожны зможа пакаштаваць і паставіць свае ацэнкі.

Упершыню ў рамках выставы пройдзе спаборніцтва сярод рэгіёнаў на найлепшую сувенірную прадукцыю, конкурс відэаролікаў і відэафільмаў па турызме.

— Адзін з важных кірункаў — прадстаўнікі вытворцаў турабсталявання. Асіповіцкі завод, напрыклад, прадставіць яхты, лодкі, катамараны, байдаркі, — расказвае Алег Андрэйчык. — Удзельнічаюць і нашы рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі. Сёння кожны можа адправіцца на адпачынак у Стайкі, Ратамку, Раўбічы, яны таксама прадстаўляюць самыя розныя забаўляльныя паслугі: ад катання на конях да плавання пад парусам на яхтах.

У рамках выстаўкі 14 красавіка ў 16 гадзін на базе Мінскай гарадской ратушы пройдзе прэзентацыя турыстычнага патэнцыялу Мінска. Адбудзецца прадстаўленне новай інтэрактыўнай праграмы, якая ў будучым стане штодзённай, а падчас дзелавой часткі будуць прадэманстраваны ўсе турыстычныя магчымасці беларускай сталіцы і шэраг навінак сезона.

Усе падрабязнасці аб 25-й выставе-кірмашы «Адпачынак-2023» можна даведацца ў рэжыме анлайн — працуе сайт. Уваход на мерапрыемства бясплатны.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

МВФ пагоршыў прагноз па тэмпах росту сусветнага ВУП

Міжнародны валютны фонд (МВФ) пагоршыў прагноз па тэмпах росту сусветнага ВУП да 2,8 працэнта сёлета і да трох працэнтаў налета, паведаміла ТАСС са спасылкай на новы даклад МВФ аб перспектывах развіцця сусветнай эканомікі. Адзначаецца, што сусветная інфляцыя будзе зніжацца, але больш павольна, чым чакалася раней — з 8,7 % у 2022 годзе да 7 % — сёлета і да 4,9 % у 2024-м. Аўтары даклада звяртаюць увагу на тое, што ў цэлым сусветная эканоміка накіравана на паступовае аднаўленне пасля магутных удараў, аднак сітуацыя па-ранейшаму застаецца складанай. Паводле слоў галоўнага эканаміста МВФ П'ера-Аліўе Гурынша, «запаволенне эканомікі сёлета сканцэнтравана галоўным чынам у развітых краінах, асабліва ў еўразоне і Злучаным Каралеўстве». У МВФ таксама адзначылі, што яшчэ адна небяспека можа быць звязана з рызыкай больш працяглага, чым меркавалася, узмацнення жорсткасці глабальных фінансавых умоў з-за «нядаўняй нестабільнасці ў банкаўскай сістэме». Пры гэтым канстатуецца, што раскол свету на супрацьлеглыя блокі ўскладняе міжнароднае супрацоўніцтва і аказвае негатыўнае ўздзеянне на сусветную эканоміку.

У Італіі аб'явілі рэжым надзвычайнай сітуацыі з-за міграцыйнага крызісу

Італьянскі ўрад аб'явіў рэжым надзвычайнай сітуацыі на шэсць месяцаў з-за міграцыйнага крызісу, паведаміла РІА «Навіны». Прычынай паслужыла «выключнае павелічэнне патоку мігрантаў», якія прыбываюць у краіну марскім шляхам па Міжземным моры. Раней міністр унутраных спраў Матэа П'янтэдозі прадставіў інфармацыю аб тым, што з пачатку 2023 года ў краіну павялічыўся паток мігрантаў амаль у чатыры разы. У краіну марскім шляхам ужо прыбыло звыш 31 тысячы чалавек. У выніку склалася крытычная сітуацыя ў цэнтрах часовага ўтрымання нелегальных мігрантаў, перш за ўсё на востраве Лампедуза. Для вырашэння міграцыйнага крызісу ў Італіі з Фонду па нацыянальных надзвычайных сітуацыях было выдзелена пяць мільёнаў еўра.

У некалькіх рэгіёнах Саудаўскай Аравіі нечакана выпаў снег

Больш за іншых пацярпела акруга Эль-Баха, паведаміла Euronews. Многія дарогі аказаліся заблакіраваныя, машыны заселі ў гурбах. Для расчысткі прыйшлося выводзіць цяжкую будаўнічую тэхніку. У дэпартаменце адукацыі Эль-Бахі заклікалі школьнікаў застацца на пару дзён дома і вучыцца дыстанцыйна, паколькі навучэнцам і настаўнікам складана дабрацца да навучальных устаноў.

ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Важна паспець пакласці збожжа не ў мокрую і не ў сухую глебу, а так, каб яму хапіла і вільгаці, і цяпла.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У Гродзенскай вобласці сяўба ранніх яравых збожжавых і зернебабовых культур (без кукурузы, грэчкі і проса) праведзена ўжо на 70 % запланаваных плошчаў. Менавіта туды — а дакладней, у старадаўняе і найпрыгажэйшае мястэчка Гервяты — мы і адправіліся.

— Ад пасяўной, праведзенай у тэрмін і якасна, залежыць, наколькі паспяховае будзе жніво, — кажа **галоўны аграном КСУП «Гервяты» Аляксандр КАВАЛЬКО.** — Будучы ўраджай закладваецца ў гэтыя дні, астатняе — унясенне ўгнаенняў, хімпраполкі, фунгіцыдныя апрацоўкі — ужо справа тэхнікі. Так што цяпер, мабыць, у нас самы адказны перыяд.

А наогул, газетныя штампы накшталт «бітвы за ўраджай» земляробы недалюбліваюць.

— Не «біцца» трэба, а ўсё рабіць планамерна, правільна і ў тэрмін, — тлумачыць Аляксандр Паўлавіч. — Працоўны дзень у нашых механізатараў цяпер, у пасяўную, з сямі раніцы да сямі-васьмі вечара. Не «ад цямна да цямна», і ноччу мы таксама не сеем. Навошта? Усяму свой час. Начныя туман і вільготнасць толькі справакуюць страты пасяўнога матэрыялу. Трактароў і камбайнаў у нас хапае, сеялкі ўсе сучасныя — і імпартныя, і айчынныя. Я вам больш скажу: нават падчас уборкі працуем да 8-9 вечара. Няма такога, каб ноччу, з фарамі, з апошніх сіл. Калі работа выбудавана разумна, а работнікі вопытныя і адказныя, то і без усякай «бітвы» можна ўсё зрабіць прафесійна і ўкласціся ў патрэбныя тэрміны.

Пераходзім на «летні час»

Сёлета ў параўнанні з мінулым годам «на летні час» аграрыі ў Гервятах перайшлі з розніцай усяго толькі ў тры дні.

На сяўбе заўсёды працуюць самыя вопытныя механізатары. Эдуард МІЛЕЙША — адзін з іх.

— Калі параўноўваць з 2022 годам, вясна падкінула пэўныя складанасці — і дождж, і снег у нас быў, і замаразкі, — распавядае галоўны аграном. — У поле мы выехалі 23 сакавіка, надвор'е дало нам папрацаваць на сяўбе тры дні, потым пачалася непагадзь і работа спынілася. І з размахам пасяўная разгарнулася ўжо з 5 красавіка. У нашай гаспадарцы землі цяжкія, так што сёлета ёсць некаторыя складанасці з падрыхтоўкай глебы — не ўсюды можна зайсці тэхнікай, мокра: самі бачыце, лужыны стаяць. Але ў цэлым, нягледзячы на ўсё гэта, у тэрміны мы ўкладваемся і пасяўную правядзём своечасова.

Дакладныя каляндарныя тэрміны, у якія варта пачаць і завяршыць сяўбу, вызначыць немагчыма, кажуць аграрыі. Нават сучаснае абсталяванне не адмяняе залежнасці сельскагаспадарчых работ ад дзівацтваў «нябеснай канцылярыі». У халодную сырую глебу сеяць не станеш. І пры гэтым вясна — не восень, вільгаць сыходзіць з зямлі хутка, і важна паспець пакласці збожжа не ў мокрую і не ў сухую глебу, а так, каб зярняткам хапіла і вільгаці, і цяпла.

У сярэднім увясну зямлі трэба аддаць каля 200 кг зярнятак на гектар.

КСУП «Гервяты» — найбуйнейшая гаспадарка ў Астравецкім раёне, 12 640 га сельгасугоддзяў, з якіх 8700 га раллі. Гаспадарка раскінулася больш чым на 50 кіламетраў. «За дзень стабільна 300 кіламетраў намотваю», кажа галоўны аграном.

— Усяго трэба засеяць 3553 гектары. З іх 850 га ячменю, 220 га зернебабовых — гэта ў першую чаргу гарох, 113 га аўса, 490 га цукровых буракоў і 1730 га кукурузы, — пералічвае ён.

Самая складаная культура для сяўбы — цукровыя буракі, распавёў галоўны аграном КСУП «Гервяты».

— Гэта культура дакладнага высеву, патрабуецца ідэальная падрыхтоўка глебы ў некалькі этапаў, акрамя таго, за васьмігадзінную змену немагчыма пасеяць звыш 20 га, — адзначае Аляксандр Кавалько. — У нас па раёне самая вялікая колькасць плошчаў з году ў год адводзіцца пад цукровыя буракі.

Што, дзе і колькі сеяць, вырашаецца яшчэ восенню: гаспадаркі рыхтуюць бізнес-планы, абараняюць іх у раёне, а раён узгадняе гэтыя планы з вобласцю. Тады ж стартуе і падрыхтоўка да наступнай пасяўной кампаніі.

— У першую чаргу мы сеем зыходзячы з таго, што трэба забяспечваць кармамі сваю жывёлагадоўлю, — тлумачыць суразмоўнік. — Пагалоўе буйной рагатай жывёлы ў «Гервятах» — 12 тысяч. Вялікі дойны статак, быкі на адкорме, свой рапсавы цэх, а таксама цэх камбікорму. Таму стаўку робім на кукурузу і рапс. Рапс мы сеем азімы, пасяўная праходзіць восенню.

Сёння засеяныя восенню палеткі ўжо зелянеюць маладымі ўсходамі, але яшчэ шмат гектараў раллі незасеяныя. У сучасных сельскагаспадарчых агрэгатах, што задзейнічаны пры сяўбе, цэлы шэраг працэсаў аўтаматызаваны і рэгулюецца камп'ютарам. Але як бы ні развівалася тэхналогіі, у пасяўную асноўным крытэрыем поспеху становіцца чалавечы фактар — вопыт, добрасумленнасць і талент работнікаў. Таму вопытныя механізатары — сапраўдны «залаты фонд».

Веды, вопыт, інтуіцыя

У КСУП «Гервяты» механізатар Эдуард Мілейша працуе з 1992 года. Гэта яго 19-я пасяўная. Ён кажа, што прафесіяналу дастаткова ўбачыць поле, каб зразумець, якія настройкі патрэбныя для сяўбы той ці іншай культуры. Механізатары тонкасці прафесіі часта перадаюць у спадчыну — ад бацькі да сына. Бацька суразмоўніка таксама ўсё жыццё працаваў на гэтых палях і лічыўся адным з найлепшых механізатараў гаспадаркі, дзе вось ужо тры дзесяцігоддзі працуе і яго сын. А наогул, працоўныя дынастыі ў «Гервятах» — справа звычайная, як і сямейны падрад, калі ў гаспадарцы, хай і ў розных сферах, працуюць усе члены сям'і. І гэта — падмурак адказных адносін да работы, якая пры такім раскладзе становіцца найважнейшай часткай жыцця.

Правільна засеянае поле — гэта скрупулёзна вытрыманая норма высеву на гектар, патрэбная глыбіня закрывання насення, а таксама якасць: каб ніводнае зярнятка не ляжала зверху, не накрытае глебай. У тэорыі ўсё гэта можна рэгуляваць настройкамі сучаснай тэхнікі. Але на практыцы вельмі многае ў дадзенай сферы па-ранейшаму робіцца толькі з дапамогай асабістага вопыту і інтуіцыі прафесіянала.

— Зямля на кожным полі розная. Можна выставіць адну глыбіню закрывання на больш лёгкіх і цяжкіх глебах — і атрымаць розны вынік, — тлумачыць значнасць вопыту галоўны аграном. — У нас на сяўбе заўсёды працуюць толькі самыя вопытныя механізатары. І Эдуард Мілейша — адзін з іх.

За працоўную змену адзін трактарыст у сярэднім засявае 35-40 гектараў. Каб засеяць поле ў 75 га, Эдуарду Мар'янавічу патрабуецца паўтара-два дні.

— Цяпер ужо, будзем спадзявацца, быццам бы наладзілася надвор'е, — кажа ён. — Праўда, даводзіцца аб'язджаць мокрыя ўчасткі: калі яны падсохнуць, будзем дасяваць.

У кожнай культуры норма высеву свая. Але ў сярэднім увясну зямлі трэба аддаць каля 200 кг (або чатыры з паловай мільёна зярнятак!) пасяўнога матэрыялу на гектар. Калі ўсё зрабіць правільна, зямля шчодра ўзнагародзіць сваіх працаўнікоў восенню — гэтыя 200-220 кілаграмаў ператворацца ў 4000 з гектара.

— Летась ураджай нас парадаваў — намалацілі 19 тысяч тон, — кажа Аляксандр Кавалько. — Сёлета спадзяёмся на такі ж, а можа быць, і больш высокі вынік. Бальнасць глебы ў нас нядрэнная для нашага раёна.

Аб прафесійнай годнасці

Для такога важкага прагнозу ў гаспадаркі ёсць усе перадумовы. Вялікі машынна-трактарны парк (каля 70 трактароў, з якіх дзесяць — найноўшыя энерганасычанныя), штат прафесіяналаў, што працуюць як мае быць (у сезон за месяц-паўтара механізатар можа зарабіць і пяць тысяч рублёў), дагледжаныя, з мінулай восені падрыхтаваныя палі.

— Сёлета мы купілі ў гаспадарку яшчэ адзін магутны трактар, — расказаў галоўны аграном. — І да яго — культыватар.

Новую тэхніку даверылі высакакласнаму механізатару — Андрэю Ясевічу.

— Традыцыйна ўсе гаспадаркі аруць на 20, максімум 25 сантыметраў, — кажа ён. — І за гады пад плугам утвараецца так званая падэшва. Яе трэба разбурыць, каб вада сыходзіла глыбока, а расліны атрымлівалі вялікую плошчу сілкавання. Такая падрыхтоўка глебы павысіць ураджайнасць.

На васьмідзесяці гектарах поля, дзе цяпер працуе Андрэй Ясевіч, будзе расці ячмень. У структуры збожжавых, якія вырошчвае гаспадарка, дадзеная культура займае важнае месца. Піваварныя сарты ячменю з Гервят, вырашчаныя з усімі тэхналагічнымі тонкасцямі, пастаўляюцца на ААТ «Белсолад». А ў цэлым, значная частка ўраджаю гаспадаркі накіроўваецца на выраб камбікармоў, іншымі словамі, ад ўраджаю, вырашчанага тут, шмат у чым залежаць якасць і колькасць не толькі раслінных і збожжавых прадуктаў на стале спажыўца, але і мяса, птушкі, малака.

— Работа на зямлі зацягвае: быццам бы яна цяжкая, часам без выхадных, здараецца — з ненармаваным працоўным днём, з адпачынкам толькі ў зімовы час. Але людзі працуюць у нашай гаспадарцы, як правіла, дзесяцігоддзямі і не збіраюцца нешта мяняць. Справа не толькі ў тым, што КСУП «Гервяты» — моцная, паспяховая гаспадарка. Сельскагаспадарчая праца дае магчымасць пераканацца ў патрэбнасці і карыснасці сваіх намаганняў. Убачыць вынік — гэта вельмі матывуе. Глядзіш, добра ўрадзілі збожжавыя, і думаеш: гэта маіх рук справа, — дзеліцца Аляксандр Паўлавіч.

Галоўнаму аграному КСУП «Гервяты» — усяго трыццаць. Гаворыць, сярод спецыялістаў і кіраўніцтва гаспадаркі шмат людзей нават маладзейшых. Але сцвярджаць, што тут робяць стаўку толькі на маладых — няправільна. Сакрэт поспеху ў сельскай гаспадарцы (і ў Гервятах тое разумеюць) — у разумным тандэме шматгадовага вопыту работы і маладога жадання «зрушыць горы».

— Вядома, гэта вельмі адказна — карміць краіну. Але часам бывае крыўдна, калі размаўляю з моладдзю, нават са сваімі аднагодкамі, далёкімі ад сельскай гаспадаркі, — дадае суразмоўнік. — Многія з іх не цэняць працу на зямлі: маўляў, што вы там такога важнага робіце? Я тады адказваю: а што вы ясце? Бо ўсё — і тая ж каўбаса, і нават піва — ад аграрнага сектара, ад працы на зямлі. Аднак маладыя людзі не думаюць пра тое, адкуль бяруцца хлеб, малако, мяса, той жа цукар на паліцах крамаў. Мала хто задумваецца, якой працай забяспечваецца харчовая бяспека. Людзі, якія выбралі сельскагаспадарчыя прафесіі і прысвяцілі ім жыццё, на мой погляд, заслугоўваюць самай вялікай павагі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

У пары з кожным механізатарам працуе кіроўца, які своечасова падвозіць збожжа для сяўбы.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

13 КРАСАВІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 7 (15951)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Ілья МІЛАШЭЎСКІ:

«Баскетбол ніколі мяне не перастане любіць, як і я яго»

Першыя маладзёжныя спаборніцтвы па баскетболе 3х3, першы чэмпіянат Еўропы да 18 гадоў прайшлі у 2015 годзе ў Мінску на Palova-арэне. Турнір па баскетболе 3х3 стаў адным з самых відовішчных у праграме II Еўрапейскіх гульняў 2019 года. Дарэчы, тады жаночая і мужчынская зборныя Беларусі сталі бронзавымі прызёрамі спартыўнага форуму. Не адстае ад іх і моладзь: беларуская жаночая зборная U-17 — бронзавы прызёр Кубка Еўропы, мужчынская зборная U-18 — бронзавы прызёр Кубка свету, у абедзвюх каманд — сярэбраныя медалі першых Гульняў краін СНД. У 2023 годзе беларускія каманды будуць змагацца за медалі II Гульняў краін СНД. Спаборніцтвы па баскетболе 3х3 12-13 жніўня прыме легендарная Palova-арэна ў Мінску.

Да важнага старту разам са сваімі таварышамі рыхтуецца Ілья Мілашэўскі, член нацыянальнай зборнай па баскетболе 3х3, прафесійнай каманды 3х3, гулец рэзервовай каманды клуба «Мінск». Сваёй гульнёй і тэхнічнай падрыхтоўкай ён паспеў выклікаць захапленне аматараў і вялікія чаканні ў спецыялістаў. У камандзе з Кірылам Васкаўцовым, Янам Марыніным, Алексеем Навойчыкам Ілья заняў пятае месца сярод 64 каманд у Студзенцкай лізе АСБ 3х3. Актыўна выступаў у Лізе Дружбы 3х3 Беларусь — Расія, дзе наша каманда скончыла выступленне на першым радку ў рэйтынгавай табліцы. Цяпер усе намаганні баскетбаліста сканцэнтраваны на выступленні ў Адзінай Кантынентальнай Лізе 3х3. А яшчэ Ілья Мілашэўскі — унікальны гулец, які спалучае баскетбол з баскетболам 3х3. Як такое магчыма, ён расказаў «Чырвонцы. Чырвонай змене».

— Ілья, як так склалася, што справай твайго жыцця стаў менавіта баскетбол?

— Усё банальна: старэйшы брат займаўся ім і прапанаваў мне паспрабаваць. Я быў не супраць, малодшыя заўсёды цягнуцца за старэйшымі. Я не вылучаўся асаблівымі фізічнымі данымі, быў большы і шырэйшы за ўсіх хлопчыкаў. Але пасля першай трэніроўкі Аляксандр Іванавіч Вярэніч мне сказаў: «Ты вельмі здольны хлопец». Не ведаю як, але ён разглядзеў ува мне патэнцыял і параіў не кідаць баскетбол. Я і не збіраўся гэтага рабіць, мне падабаліся трэніроўкі, яшчэ больш падабаліся турніры. Некаторыя скептыкі казалі, што з мяне нічога не выйдзе. А з мяне выйшаў гулец нацыянальнай зборнай.

— Ты выхаванец школы баскетбольнага клуба «Мінск», зараз выступаеш у рэзервовай камандзе. Як гэта — пачынаць кар'еру ў вядучым клубе краіны?

— Я з самага пачатку свайго баскетбольнага шляху бачу ўзровень, да якога павінен імкнуцца. Наш клуб — гэта дакладна выбудаваная структура. Не кожны клуб можа ганарыцца сваёй дзіцячай школай, рэзервовай камандай, у якой маладыя баскетбалісты набіраюцца практыкі. Мы паступова, крок за крокам, з дапамогай спецыялістаў расцём і развіваемся. І мне падабаецца ісці такім шляхам. Вельмі важна, што мы з дзяцінства знаёмыя з гульцамі, у якіх многаму можна навучыцца. На маёй пазіцыі, напрыклад, гэта Саша Кудраўцаў. Гэта чалавек, які паказвае неблагі ўзровень. Ён шмат працаваў над сабой, над сваім здароўем, каб заставацца ў такой форме. Я з дзяцінства ведаю Аляксея Лашкевіча, які зараз трэніруе «маладзёжку», мне падабаўся яго баскетбол. І, канешне, капітан каманды «Мінск» Аляксей Трасцянецкі — гулец, якому можна пазайздросціць, таму што паказваць такі ўзровень у яго гады — дарагога варта.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Абітурыент–2023

Стаць студэнтам БДУІР: алгарытм паспяховага паступлення

Чым бліжэй прыёмная кампанія, тым больш пытанняў

«Калі вы гатовы шмат працаваць і плануеце атрымаць добрую інжынерную адукацыю, то апынуліся ў правільным месцы, — звярнуўся да абітурыентаў падчас Дня адкрытых дзвярэй рэктар БДУІР, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Вадзім БОГУШ. — Задача нумар адзін для вас — паступіць у наш універсітэт. Другая не менш важная задача — паспяхова вучобу скончыць. Паверце, што на загадзе аб залічэнні ва ўніверсітэт студэнцкае жыццё толькі пачынаецца...»

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Лакацыі актыўнасці

А МЫ — У СТУДАТРАД!

Падчас промапраекта Беларускіх студэнцкіх атрадаў «Выбіраем студатрад!» заяўкі на работу ў студатрадах падалі каля 13 тысяч патэнцыяльных удзельнікаў студатрадаўскага руху, паведамілі ў ЦК БРСМ.

Фота з сайта БРСМ.

У рамках праекта «Выбіраем студатрад!» заключана 115 дагавораў на працаўладкаванне ў складзе студэнцкіх атрадаў 1964 чалавек, у тым ліку для ўдзелу ў працоўных праектах «Атлант-2023» (у ЗАТ «Атлант»), «Аўтазаводзец-2023» (у ААТ «МАЗ»), «Пуцейцы» і «Дарога магчымасцяў» (на аб'ектах Беларускай чыгункі), у праекце «Гомсельмаш-2023» (у ААТ «Гомсельмаш»). Акрамя таго, у рамках круглагадовай працоўнай занятасці з пачатку года ў складзе 100 атрадаў працаўладкавана 1618 чалавек. Заяўкі для работы ў атрадах у трэцім працоўным семестры падалі 12 870 чалавек, у тым ліку 843 непаўналетнія.

Традыцыйны промапраект БСА «Выбіраем студатрад!» стартаваў 20 лютага. Ён накіраваны на інфармаванне патэнцыяльных удзельнікаў студатрадаўскага руху аб магчымасцях працаўладкавання ў перыяд трэцяга працоўнага семестра і фарміраванне студэнцкіх атрадаў. Важны складнік праекта — падрыхтоўка студэнцкіх атрадаў да работы і дагаворная кампанія.

Для работы студэнцкіх атрадаў сёлета пералікам прымаючых арганізацый, аб'ектаў, відаў работ і колькасці працоўных месцаў прадугледжаны 171 аб'ект на 36 455 працоўных месцаў.

Студатрадаўскі рух — адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці БРСМ. У 2022 годзе ў складзе 2910 студэнцкіх атрадаў былі працаўладкаваны 42 493 чалавекі, у тым ліку 19 558 непаўналетніх.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Кофе Carte Noire на iPhone»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Кофе Carte Noire на iPhone» (далее – Правила), направленной на стимулирование реализации напитков из зернового кофе ТМ Carte Noire на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями) и определяют порядок проведения рекламной игры «Кофе Carte Noire на iPhone» (далее – Рекламная игра).

1. Организатор Рекламной игры

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192452588 (далее – Организатор). Юридический адрес Организатора: 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 21, корп. 5, оф. пом. 152, этаж 1.

2. Заинтересованное лицо

Заинтересованным лицом Рекламной игры (далее – Заинтересованное лицо) является:

Общество с дополнительной ответственностью «Мостра-Групп», зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 25 марта 1997 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101228755. Юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 29-101.

3. Участники Рекламной игры

Участниками Рекламной игры могут быть достигшие возраста 18 лет физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, которые выполнили условия п. 10 настоящих Правил (далее – Участник).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и (или) заинтересованным лицом, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

4. Название Рекламной игры: «Кофе Carte Noire на iPhone»

5. Территория проведения Рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть») на территории Республики Беларусь.

6. Дата начала Рекламной игры: 17 апреля 2023 г.

7. Дата окончания Рекламной игры: 6 июля 2023 г.

8. Наименование товаров, изготовленных из зернового кофе ТМ Carte Noire, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра (Игровой продукт):

Напиток «Кофе Американо»
Напиток «Кофе Капучино»
Напиток «Кофе Латте»
Напиток «Кофе Эспрессо»
Напиток «Кофе Мокачино»
Напиток «Кофе Лунго»
Напиток «Кофе Флэт Уайт»
Напиток «Кофе с молоком»
Напиток «Кофе Эспрессо двойной»
Напиток «Кофе с молоком большой»
Напиток «Кофе Капучино большой»
Напиток «Кофе Американо большой»
Напиток «Кофе Латте большой»
Напиток «Кофе Мокачино большой»
Напиток «Кофе Флэт Уайт большой»
Напиток «Кофе Кава-Цікава»
Напиток «Кофе Американо гранд»
Напиток «Кофе Капучино гранд»
Напиток «Кофе Латте гранд»
Напиток «Кофе Латте холодный большой»
Напиток «Кофе Капучино холодный большой»
Напиток «Кофе Ванильный латте»
Напиток «Бамбл»
Напиток «Айспрессо»
Напиток «Кофе Американо фирменный»
Напиток «Кофе Капучино фирменный»
Напиток «Кофе Капучино с карамелью фирменный»
Напиток «Кофе Капучино двойной фирменный»
Напиток «Кофе Латте фирменный»
Напиток «Кофе Латте двойной фирменный»
Напиток «Кофе Эспрессо фирменный»
Напиток «Кофе Эспрессо Лунго фирменный»
Напиток «Кофе Эспрессо двойной фирменный»
Напиток «Кофе Мокачино фирменный»
Напиток «Кофе Флэт Уайт фирменный»
Напиток «Кофе с молоком фирменный»
Напиток «Кофе Раф фирменный»
Напиток «Кофе Глясе фирменный»
Напиток «Кофе Лавандовый Латте»
Напиток «Кофе Мятный Латте фирменный»
Напиток «Кофе Мятный Мокачино фирменный»

9. Состав и размер призового фонда Рекламной игры.

Призовой фонд составляет: **55 831,20 (Пятьдесят пять тысяч восемьсот тридцать один) белорусский рубль 20 копеек.**

Призовой фонд сформирован за счет денежных средств Организатора и имущества Заинтересованного лица.

Таблица № 1. Призовой фонд Рекламной игры

№ п/п	Наименование приза	Определение приза	Кол-во	Стоимость с НДС за ед., бел. руб.	ИТОГО стоимость с НДС, бел. руб.	Даты и время розыгрышей
1	Приз 1	Мобильный телефон Apple iPhone 14 128GB цвет Starlight / цвет Midnight / цвет Blue	16	3 060,00	48 960,00	27.04.2023 в 14.00 04.05.2023 в 14.00 11.05.2023 в 14.00 18.05.2023 в 14.00 25.05.2023 в 14.00 01.06.2023 в 14.00 08.06.2023 в 14.00 15.06.2023 в 14.00
		Денежные средства в размере возмещения подоходного налога за приз		429,45	6 871,20	Точное количество и цвет разыгрываемых призов в еженедельных розыгрышах указаны в Таблице 2 Правил

10. Порядок участия в Рекламной игре:

10.1. Для участия в Рекламной игре необходимо выполнить следующие условия:

10.1.1. Иметь зарегистрированную Карту «Заправка» либо приобрести данную Карту «Заправка» и заполнить анкету участника Программы «Заправка» (далее – Анкета) в сроки, указанные в Таблице № 2, указав при этом свои достоверные данные, а именно: фамилию, собственное имя, отчество (если таковое имеется), дату рождения, номер мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенный пункт, а также адрес электронной почты.

10.1.2. Предоставить согласие на обработку персональных данных и участие в Рекламной игре путем проставления отметки в личном кабинете на сайте azs.belorusneft.by.

10.1.3. Совершить покупку Игрового продукта в период с 17 апреля 2023 г. по 11 июня 2023 г. включительно с использованием Карты «Заправка».

10.1.4. Участнику игры присваивается 1 (один) номер Участия за каждый приобретенный Игровой продукт в периоды, указанные в Таблице № 2 в соответствии с датой и временем покупки.

10.1.5. Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

11. Место, даты, время и порядок проведения Розыгрышей призового фонда, порядок определения победителей Рекламной игры.

11.1. Розыгрыши Приза 1 проводятся открыто в присутствии комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 21, корп. 5, оф. пом. 152, этаж 1 в 14.00 в соответсвии с датами, указанными в Таблице № 2.

Таблица № 2. Розыгрыши призов

Дата и время еженедельного розыгрыша	Период выполнения условий согласно п.10.1.	Разыгрываемые Призы
27.04.2023 г. в 14.00	с 17.04.2023 г. (00.00.00) по 23.04.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Starlight)
04.05.2023 г. в 14.00	с 24.04.2023 г. (00.00.00) по 30.04.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Starlight)
11.05.2023 г. в 14.00	с 01.05.2023 г. (00.00.00) по 07.05.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Starlight)
18.05.2023 г. в 14.00	с 08.05.2023 г. (00.00.00) по 14.05.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Midnight)
25.05.2023 г. в 14.00	с 15.05.2023 г. (00.00.00) по 21.05.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Midnight)
01.06.2023 г. в 14.00	с 22.05.2023 г. (00.00.00) по 28.05.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Midnight)
08.06.2023 г. в 14.00	с 29.05.2023 г. (00.00.00) по 04.06.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Blue)
15.06.2023 г. в 14.00	с 05.06.2023 г. (00.00.00) по 11.06.2023 г. (23.59.59)	Приз 1 – 2 шт. (цвет Blue)

11.2. Механика проведения розыгрышей Приза 1:

Для каждого розыгрыша Приза 1 в установленном порядке формируется единый список Участников (далее – Список) с указанием присвоенного Участнику Рекламной игры номера Участника, номера учетной записи Участника в программе «Заправка» (далее – Номер ID), номера Карты «Заправка», фамилии, собственного имени, отчества (если таковое имеется) Участника Рекламной игры, даты рождения, электронного адреса, телефона, населенного пункта, указанного в Анкете, даты и времени совершения покупки.

В случае если дата и время покупки Участников полностью совпадают, номер Участника присваивается по номеру ID в порядке возрастания (первым номер присваивается Участнику, у которого номер ID имеет меньший порядковый номер).

Все номера Участников Рекламной игры имеют одинаковую разрядность.

Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице № 2 настоящих Правил.

Для проведения розыгрышей используются специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера первого получателя Приза 1 в каждом розыгрыше происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Участника Рекламной игры в барабан помещаются шары с номерами, соответствующими первому разряду порядковых номеров Участников, входящих в диапазон Списка соответствующего розыгрыша. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Участника Рекламной игры.

Далее для определения цифры в следующем разряде формируемого выигрышного номера Участника Рекламной игры в барабан загружаются шары с номерами, которые существуют в соответствующем разряде номеров Участников Рекламной игры в Списке соответствующего периода. Шары перемешиваются, и из барабана извлекается один шар. Номер шара вносится в протокол и записывается в соответствующий разряд формируемого выигрышного номера Участника Рекламной игры.

Следующим 1 (одним) победителем Приза 1 для каждого из розыгрышей становится последовательно Участник Рекламной игры с номером через каждую 1000 номеров от последнего выигрышного номера Участника.

Для каждого Приза 1 определяется один Резервный победитель, которым становится Участник Рекламной игры с номером Участника, следующим за выигрышным. Если следующий за выигрышным номер Участника принадлежит Победителю текущего Приза 1, то выигрышным становится следующий после него номер иного Участника.

В случае если выигрышный номер Участника находится в конце Списка, то дальнейшее исчисление для определения Победителей (в т. ч. Резервный Победитель) продолжается с начала Списка.

11.2.1. При проведении розыгрышей Комиссией оформляется соответствующий протокол.

11.2.2. Участники Рекламной игры вправе присутствовать при проведении розыгрышей.

12. Порядок уведомления победителей о результатах розыгрыша, порядок получения призов.

12.1. Победители Рекламной игры извещаются о выигрыше посредством отправки письма на адрес электронной почты, звонка и SMS на абонентский номер мобильного телефона, указанные в Анкете Участника в срок не позднее 3 дней после розыгрыша.

12.2. Для получения Призов Победитель Рекламной игры должен до 23 июня 2023 г. явиться по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 21, корп. 5, оф. пом. 152, этаж 1, предварительно связавшись с Организатором по телефону (+375 44) 707-02-69 (звонок тарифицируется согласно тарифам оператора, услугами которого пользуется Участник). Связаться с Организатором и получить Призы можно с понедельника по пятницу с 11.00 до 18.00. По просьбе Победителя, выраженной до 20 июня 2023 г. в форме письменного заявления на адрес электронной почты: igracofecn@gmail.com. Призы могут быть высланы до 23 июня 2023 г. почтой на адрес, указанный Победителем в письменном заявлении.

При получении Приза 1 Победитель обязан представить оригинал документа, удостоверяющего личность (паспорт либо ID-карту – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан).

12.3. В случае если в установленные данными Правилами сроки не удается связаться с Победителями любым из указанных выше способом, либо Победители не предоставят данные, необходимые для получения Призов, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным при заполнении Анкеты, либо Победители отказываются от Призов, либо Победители не явились за получением Призов, право на Призы переходит Резервным Победителям.

12.4. Резервный Победитель Приза 1 уведомляется способами, предусмотренными п. 12.1 настоящих Правил, в срок не позднее 28 июня 2023 г. Срок получения Резервным Победителем Приза 1 в месте, указанном в п. 12.2, с обязательным представлением документов, предусмотренных п.12.2 настоящих Правил, – не позднее 4 июля 2023 г. По просьбе Резервного Победителя, выраженной до 30 июня 2023 г. в форме письменного заявления на адрес электронной почты: igracofecn@gmail.com, Призы 1 могут быть высланы до 4 июля 2023 г. почтой на адрес, указанный Резервным Победителем в письменном заявлении.

12.5. Организатор при выдаче Призов Победителям Рекламной игры признается налоговым агентом и несет ответственность за соблюдение действующего налогового законодательства Республики Беларусь. Выдача Призов производится путем передачи Призов Победителям за вычетом суммы денежных средств, которая перечисляется Организатором в бюджет Республики Беларусь в порядке, определенном налоговым законодательством Республики Беларусь, если иное не предусмотрено законодательством Республики Беларусь.

12.6. Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов или для присутствия на розыгрышах.

12.7. В случае если Победители (соответственно Резервные Победители) не могут приехать за получением Призов лично, Призы могут получить их доверенные лица при предъявлении копии паспорта (документа его заменяющего) Победителя (соответственно Резервного Победителя) своего паспорта (документа его заменяющего) и нотариально заверенной либо приравненной к таковой доверенности от Победителя (соответственно Резервного Победителя).

12.8. Участники Рекламной игры, претендующие на получение Призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Рекламной игры для получения Призов и выполнения Победителем иных условий Игры.

13. Комиссия по проведению Рекламной игры.

Для контроля соблюдения официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

Председатель Комиссии — Хазырбекова Анастасия Ринатовна, ООО «Пиар Куб», заместитель директора по коммерческим вопросам.

Члены комиссии:

1. Нахайчук Светлана Геннадьевна, ООО «Пиар Куб», менеджер по реализации проектов;

2. Ксензова Александра Дмитриевна, ООО «Пиар Куб», маркетолог;

3. Владимирович Татьяна Яковлевна, ООО «Пиар Куб», бухгалтер;

4. Галай Лилия Юрьевна, ОДО «Мостра-групп», специалист по трейд-маркетингу.

14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.

14.1. Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 6 июля 2023 г. включительно.

14.3. Информацию о Правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайтах azs.belorusneft.by и mostra.by, а также по телефону горячей линии (+375 44) 707-02-69 с понедельника по пятницу с 12.00 до 19.00, в субботу с 12.00 до 16.00 (стоимость звонка тарифицируется в соответствии с тарифами мобильного оператора, услугами которого пользуется Участник).

15. Прочие условия

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

15.2. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет (например, плохое соединение с провайдером, поломки в сети и т. д.).

15.3. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Победителями в случае недостоверной информации, предоставленной Участниками.

15.4. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

15.5. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору игры по адресу: РБ, 220030, г. Минск, а/я 196.

Свидетельство № 4298 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 4 апреля 2023 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ»

Полное наименование покупателя акций: Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой».

Место нахождения покупателя акций: 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49/1-1. Контактный телефон покупателя акций +375 17 317 54 21.

Наименование и местонахождение открытого акционерного общества, акции которого приобретаются: Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» (место нахождения: 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49/1-1).

Цель приобретения акций: последующая безвозмездная передача государству.

Количество приобретаемых акций: 14 300 (четырнадцать тысяч триста) штук простых (обыкновенных) акций.

Цена приобретения одной акции: 28 (двадцать восемь) рублей за одну акцию.

Форма и срок оплаты акций: расчет за акции производится в срок не позднее 7 (семь) рабочих дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» Общества, путем безналичного перечисления денежных средств (белорусских рублей) на банковский счет (карт-счет) продавца акций.

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций на неорганизованном рынке: **220050, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32, комн. 502 (унитарное предприятие «АСБ БРОКЕР»).**

Дата начала и окончания срока представления акционерами предложений о продаже акций: **с 15 мая 2023 г. по 16 июня 2023 г. включительно**.

Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций): **с 14 августа 2023 г. по 15 сентября 2023 г. включительно**.

Адрес, по которому направляются предложения акционеров о продаже акций: 220037, г. Минск, ул. Аннаева, д. 49/1-1.

Директор ОАО «Минсктелекомстрой»
Д.В. Степановский

УНП 100068131

ИНФОРМАЦИЯ О ВЫПЛАТЕ ДИВИДЕНДОВ

Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой» извещает своих акционеров о том, что в соответствии с решением очередного общего (годового) собрания акционеров (протокол № 37 от 27 марта 2023 г.) утверждены дивиденды за 2022 год в размере 1,89640 рублей на одну акцию, которые будут выплачены в период с 26 апреля 2023 г. по 23 июня 2023 г. Выплата дивидендов на долю акций, принадлежащих государству, будет произведена в десятидневный срок с объявленной даты их выплаты, но не позднее 22 апреля 2023 г.

Перечисление будет осуществляться в безналичном порядке:

- юридическим лицам – на расчетные счета;
- физическим лицам – на вкладные счета и карт-счета.

Справки по телефону +37517 317-54-21

УНП 100068131

Стаць студэнтам БДУІР: алгарытм паспяховага паступлення

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сустрэча з кіраўнікамі ВНУ і членамі прыёмнай камісіі — абавязковы пункт у праграме кожнага Дня адкрытых дзвярэй. Яны, дарэчы, праводзяцца цягам навучальнага года некалькі разоў. Але чым бліжэй чарговая прыёмная кампанія — тым больш пытанняў узнікае ў патэнцыяльных абітурыентаў. Да таго ж сёлета адбор у студэнты будзе праходзіць па новых Правілах прыёму: па-першае, пашырыўся мэтавы набор і змяніўся парадак адбору прэтэндэнтаў на мэтавыя месцы. Па-другое, прыёмныя камісіі будуць упершыню прымаць сертыфікаты і цэнтралізаванага экзамену, і ЦТ. Па-трэцяе, у асобных катэгорый абітурыентаў з'явіліся пэўныя прывілеі. Пашырыўся і пералік спецыяльнасцяў, вострa запатрабаваных эканомікай...

— У мяне часта пытаюцца, а чаму ў ваш універсітэт няма конкурсу, скажам, сем чалавек на адно месца? Трэба разумець, што калі інфармацыя аб колькасці пададзеных заяў і сумах балаў, з якімі паступаюць абітурыенты, знаходзіцца ў свабодным доступе на нашым сайце і рэгулярна абнаўляецца, то кожны можа ўбачыць, з якімі баламі бессэнсоўна спрабаваць стаць студэнтам БДУІР, а лепш падумаць пра іншую траекторыя навучання, — канстатуе Вадзім Богуш.

Варта нагадаць, што абітурыенты БДУІР маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты. Калі абітурыент не праходзіць па балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей. Прычым пры падачы дакументаў ён можа падаць адразу дзве заявы: на бюджэтную і платную формы навучання. Пры гэтым пералік спецыяльнасцяў, іх колькасць і прыярытэты могуць быць розныя для дзвюх заяў. У выпадку непаступлення на бюджэт заява абітурыента будзе ўлічана ў конкурсе на платную форму навучання, што не запатрабуе дадатковага візіту ў прыёмную камісію.

Ва ўніверсітэце ўсе спецыяльнасці падзелены на два профілі: тэхніка-тэхналагічны і інжынерна-эканамічны. У першым выпадку здаецца матэматыка і фізіка, у другім — матэматыка і замежная мова. Зразумела, што калі на руках у абітурыента будуць сертыфікаты па матэматыцы і замежнай мове, то на тэхніка-тэхналагічны профіль яны паступіць не змогуць. Адметнасцю сёлетняга года стане неабходнасць пры расстаноўцы прыярытэтаў указваць не толькі спецыяльнасць, але і факультэт, таму што на розных факультэтах ёсць падобныя спецыяльнасці.

«Ці чакаецца істотны рост прахадных балаў у сувязі з увядзеннем новых цэнтралізаваных экзаменаў?» — цікавіліся ў кіраўнікоў прыёмнай камісіі ўсхваляваныя абітурыенты.

— Прагназаваць прахадныя балы — справа няўдзячная. Не думаю, што сітуацыя моцна зменіцца. Мяркую, можна арыентавацца на лічбы мінулага года, — заспакоіў Вадзім Богуш. — Інфармаванне аб колькасці пададзеных заяў і балах, якія заяўляюць абітурыенты, у нас адбываецца анлайн, і калі колькасць заяў пачынае перавышаць колькасць месцаў, мы пачынаем інфармаваць аб паўпрахадным бале. Вы будзеце бачыць, наколькі канкурсная сітуацыя для вас крытычная.

Дарэчы, трэба мець на ўвазе, што летась адзінаццаць абітурыентаў універсітэта па колькасці набраных балаў трапілі ў прамежак ад 391 да 400. Абсалютнай рэкардсменкай сярод усіх беларускіх абітурыентаў стала Анастасія Більдзь. У суме ў яе атрымаўся максімум — 400 балаў. Яна і яшчэ дзевяць абітурыентаў, якія набралі больш за 390 балаў, паступалі на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак. Яшчэ адна абітурыентка выбрала факультэт камп'ютарнага праектавання.

Тройка самых папулярных у абітурыентаў мінулага года спецыяльнасцяў (іх яны ўказалі ў сваёй заяве першай сярод прыярытэтаў) выглядае наступным чынам: «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» (тут жа быў зарэгістраваны і самы высокі прахадны бал — 374), «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» і «Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі».

«Якія прывілеі прадугледжаны для навучэнцаў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка?» — працягвалі цікавіцца абітурыенты.

— Тыя з іх, хто паспяхова прайшлі навучанне і атрымалі рэкамендацыю назіральнага савета гэтай установы, змогуць паступіць на адпаведны профіль без здачы экзаменаў, па гутарцы, — праінфармаваў рэктар БДУІР. — Пералік спецыяльнасцяў можна паглядзець на нашым сайце. Іх даволі шмат. Ва ўніверсітэце будзе створана спецыяльная камісія з прафесіяналаў для правядзення сумоўя. Яго мэта — ацаніць дзелавыя якасці, здольнасці, матывацыю і ўзровень падрыхтоўкі гэтай катэгорыі абітурыентаў. Я ведаю, наколькі матываваныя і добра падрыхтаваныя хлопцы і дзяўчаты навучаюцца ў дзіцячым тэхнапарку, таму не думаю, што гутарка будзе для іх сур'ёзным выпрабаваннем. Хоць, безумоўна, да любога мерапрыемства трэба ўсё ж такі рыхтавацца...

Адказны сакратар прыёмнай камісіі БДУІР Васіль БАНДАРЫК паведаміў, што ва ўніверсітэце сёлета чакаецца далейшае пашырэнне мэтавай падрыхтоўкі ў інтарэсах заказчыкаў кадраў. Гэта звязана са зняццем абмежаванняў для арганізацый, якія могуць падаваць заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Колькасць месцаў для атрымання вышэйшай адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў даводзіцца Міністэрствам адукацыі штогод да 1 мая.

Таксама ў гэтым годзе чатыры спецыяльнасці, па якіх вядзецца падрыхтоўка ў БДУІР, былі аднесены да найбольш запатрабаваных эканомікай: гэта спецыяльнасці «Мікра- і нанаэлектроніка», «Электронныя сістэмы і тэхналогіі», «Радыёсістэмы і радыётэхналогіі», «Нанатэхналогіі і нанаматэрыялы». На іх без уступных іспытаў будуць залічвацца ўладальнікі дыпломаў I, II, III ступені трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, школьныя медалісты і абітурыенты, якія маюць дыплом аб прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай.

«Калі на адно месца прэтэндуюць два абітурыенты з аднолькавай колькасцю балаў, каго з іх залічаць? Якія дадатковыя крытэрыі будуць брацца пад увагу?»

— У такім выпадку прыёмная камісія кіруецца пунктам 27 Правіл прыёму. Там пералічаны ўсе крытэрыі. Адразу скажу, што бярэцца пад увагу адзнака па першым профільным прадмеце ўступных іспытаў — у БДУІР гэта матэматыка. Перавагу будзе мець і абітурыент, які мае пасля заканчэння школы медаль або дыплом з адзнакай пасля заканчэння каледжа. Увогуле, у практыцы нашай прыёмнай камісіі нам заўсёды хапала вызначанага Правіламі прыёму пераліку крытэрыяў для таго, каб прыняць адназначнае рашэнне па конкурснай сітуацыі, — запэўніў Вадзім Богуш. — А вось характарыстыка, якую павінны будуць прадставіць сёлета выпускнікі школ, на конкурс уплываць не будзе. Гэта інфармацыя трапіць у асабовую справу першакурсніка і будзе выкарыстана, каб аблегчыць уваходжанне ўчарашняга абітурыента ў студэнцкае жыццё. З улікам яго інтарэсаў яму будуць прапанаваны розныя актыўнасці, з якіх, акрамя вучобы, складаецца студэнцкае жыццё: удзел у спартыўных секцыях, творчых калектывах, студэнцкім самакіраванні і гэтак далей.

«На якіх умовах будзе выдзяляцца месца ў студэнцкім інтэрнаце?»

— Усіх першакурснікаў, незалежна ад формы атрымання адукацыі (на бюджэце ці за ўласныя грошы), мы забяспечваем месцам у інтэрнаце. А далей ужо ўсё будзе залежаць ад вас, — праінфармаваў Вадзім Богуш, — таму што, на жаль, пакуль мы не можам задаволіць патрэбы ў інтэрнаце ўсіх студэнтаў. Ёсць рэйтынгі, якія ўлічваюць паспяховасць студэнта, яго ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта, навуковай дзейнасці... Зыходзячы з гэтага, пасля заканчэння першага курса вырашаецца пытанне з месцам у інтэрнаце на наступны навучальны год. У пытанне з размеркаваннем месцаў у інтэрнаце вельмі актыўна ўцягнуты студэнцкі прафсаюз. Спадзяюся, што з уводам яшчэ аднаго інтэрната працэнт забяспечанасці будзе дастаткова высокі і мы зможам падтрымаць усіх паспяховых студэнтаў.

«Я шчыра жадаю, каб вашы мары, звязаныя з нашым універсітэтам, спраўдзіліся. Жадаю усім паспяховага завяршэння школьнага перыяду і лёгкага ўваходжання ў новы, вельмі важны, этап вашага жыцця, — падсумаваў Вадзім Богуш. — Студэнцкія гады заўсёды прыгадваюцца з цеплынёй. Няхай і вам будзе што ўспомніць...»

Надзея НІКАЛАЕВА, фота прэс-службы БДУІР.

Цікавы факт

А ці ведаеце вы, што ў БДУІР увялі новы від адукацыі, які прадугледжаны ў абноўленым Кодэксе аб адукацыі — спецыяльную вышэйшую. Навучанне па спецыяльнасці «Электронныя і кіравальныя сістэмы фізічных установак» вядзецца па бесперапыннай адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі, у выніку якой за 5,5 года выпускнікі атрымліваюць кваліфікацыю «інжынер» і ступень магістра. Ва ўніверсітэце гэта адзіная спецыяльнасць з такой сістэмай навучання.

Трэці працоўны

ПАПОЎНІЦЬ ШЭРАГІ ПУЦЕЙЦАЎ

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Беларуская чыгунка падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве па арганізацыі навучання рабочым прафесіям. Подпісы пад дакументам паставілі другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ПРОХАРАЎ і намеснік начальніка Беларускай чыгункі Пётр СТОЦКІ.

Прадметам пагаднення з'яўляецца арганізацыя навучання студэнтаў і навучэнцаў устаноў адукацыі, якія жадаюць працаваць у складзе студэнцкіх атрадаў (сэрвісных, будаўнічых) на аб'ектах Беларускай чыгункі, па адукацыйнай праграме прафесійнай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабочых (служачых) па прафесіях: «Праваднік пасажырскага вагона», «Манцёр пуці» і «Слесар па рамонце рухомага саставу», а таксама па іншых рабочых прафесіях у адпаведнасці з патрэбай Беларускай чыгункі.

Навучанне будзе праводзіцца на падставе асобных дагавораў, заключаных паміж ЦК БРСМ і Дарожным цэнтрам па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў Беларускай чыгункі.

Пагадненне ўступіла ў сілу з даты яго падпісання і дзейнічае да 31 снежня 2024 года ўключна. Дзеянне пагаднення можа быць прадоўжана па ўзаемнай згодзе бакоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ліку найлепшых

«Руляць» маладзёжныя лакаматыўныя

Беларуская чыгунка падвяла вынікі спаборніцтва сярод маладзёжных лакаматыўных брыгад па выніках работы за 2022 год. Трэба адзначыць, што большасць сяброў маладзёжных лакаматыўных брыгад знаходзяцца ў ГА «БРСМ».

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, усяго ў дарожным спаборніцтве прынялі ўдзел шэсць брыгад — пераможцаў адборачных тураў, якія праходзілі ў аддзяленнях БЧ.

Удзельнікі ацэньваліся па наступных крытэрыях: забеспячэнне брыгадай выкананне графіка руху цягнікоў, норм расходу паліўна-энергетычных рэсурсаў, узровень адукацыі маладзёжнай лакаматыўнай брыгады, удзел машыніста ў правядзенні школ перадавога вопыту і інш.

Па выніках спаборніцтва пераможцам стала маладзёжная лакаматыўная брыгада лакаматыўнага дэпо «Мінск» Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі (машыніст электравоза Аляксандр Вянглоўскі і памочнік машыніста электравоза Васіль Антановіч).

Другое месца прысуджана маладзёжнай лакаматыўнай брыгадзе лакаматыўнага дэпо «Гомель» Гомельскага аддзялення беларускай магістралі (машыніст дызель-цягніка Дзмітрый Янкоў, памочнік машыніста дызель-цягніка Леанід Селязнёў).

Трэцяга месца ўдастоена маладзёжная лакаматыўная брыгада лакаматыўнага дэпо «Брэст» Брэсцкага аддзялення БЧ (машыніст цеплавоза Сяргей Гальчук, памочнік машыніста цеплавоза Канстанцін Тукмакаў).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛЯДА МАЛАДЫХ

Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ:

«ГАЛОЎНАЕ — НЕ ЎПУСКАЦЬ ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ»

Старшыня Маладзёжнага парламента пра ўдзел моладзі ў працэсе

пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь — заканатворчасці і яе ролю ў сучасным грамадстве

Фота Яўгена ГРОЗАВІКА

У свае 25 гадоў ён актыўна ўдзельнічае ў грамадска-палітычным жыцці краіны, кіруе калектывам у амаль паўтары сотні чалавек. Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ — старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь. Консультацыйна-дарадчы орган, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках, быў створаны ў ліпені 2020 года. Праз два гады — у жніўні 2022-га — паўнамоцтвы маладых парламентарыяў першага склікання былі перададзены такім жа актыўным і ініцыятыўным хлопцам і дзяўчатам, якія прадстаўляюць усе рэгіёны краіны. Некаторыя працягнулі сваю дзейнасць у складзе Маладзёжнага парламента. Мікіта Рачылоўскі — ужо ў новым статусе.

У інтэрв'ю старшыня Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь расказаў, якія задачы стаяць перад другім скліканнем Маладзёжнага парламента. Ці чуюць голас моладзі на самым высокім узроўні і якія ініцыятывы рэалізуюваюць маладыя людзі — пра гэта і іншае наша размова.

— Мікіта, ці задумваліся раней, што ў 25 гадоў вашым штодзённым дрэс-кодам будзе дзелавы касцюм? Як сябе адчуваеце ў такім убранні?

— Напэўна, не задумваўся. Больш за ўсё мне падабалася паўсядзённае, нефармальнае адзенне. Паступова яшчэ ў студэнцкія гады колькасць афіцыйных мерапрыемстваў пачала павялічвацца, і касцюм даводзілася надзяваць ужо некалькі разоў на тыдзень. Цяпер гэта паўсядзённы атрыбут майго гардэроба. Калі я сустракаю сваіх калег ці сяброў у нефармальнай абстаноўцы і яны мяне бачаць у паўсядзённым адзенні (як кажуць, цывільным), то ўспрымаюць іначай. Жартуюць, што думалі, быццам я ў касцюме нават сплю. Прызнаюся, што сам да афіцыйна-дзелавога стылю ўжо прызвычаіўся, мне вельмі камфортна ў касцюме.

— Кім марылі стаць у дзяцінстве?

— Шчыра скажу, пэўнай мэты не было. Некаторыя мараць быць настаўнікам, пажарным, касманаўтам... Я доўгі час не мог вызначыцца з прафесіяй, таму пасля 9 класа паступіў у Мінскі дзяржаўны механіка-тэхналагічны прафесійна-тэхнічны каледж. Атрымаў адукацыю кухара, вальшчыка мяса і пайшоў працаваць. Праз некаторы час паступіў у гэты ж каледж — на спецыяльнасць «Тэхнік-тэхнолаг мясных прадуктаў». Працуючы і кухарам, і тэхнолагам, разумеў, што гэта не тое, чым бы хацеў займацца ўсё жыццё. Я цікавіўся тэмай гісторыі, культуры — напэўна, гэта і падштурхнула мяне паступіць у Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Спецыяльнасць для мяне была прыцыпавая — «Гісторыя і сусветная мастацкая культура». Разумеў, што кожны будучы гісторык вывучае і грамадазнаўства, і краязнаўства, а вось так глыбока сусветную мастацкую культуру вывучаюць не ўсе, а мне гэтага вельмі хацелася. У першую чаргу для пашырэння свайго кругагляду.

— Ці ўдалося папрацаваць настаўнікам гісторыі?

— Толькі падчас вучэбнай практыкі. Пасля заканчэння першай ступені вышэйшай адукацыі паступіў у магістратуру гістарычнага факультэта БДПУ. Хутка адбудзецца размеркаванне — і, хутчэй за ўсё, я пайду працаваць у школу.

— Мікіта, а ці ёсць настаўнікі ў сям'і?

— Не. Нарадзіўся ў самай звычайнай сям'і. Бацька ў мяне — кіроўца, мама — таваразнавец. Хоць па адукацыі мама — гадзіншчык. Ніколі ў сям'і не было ні дзяржаўных служачых, ні начальнікаў. Я — адзінае дзіця ў бацькоў. Таму імкнуся не падвесці ні іх, ні бабулю з дзядулем, у якіх я першы ўнук. Сям'я мне дала многае. Родныя навучылі стасункам з людзьмі, давалі правільныя ўстаноўкі на розныя жыццёвыя сітуацыі. З маленства засвоіў, што працаваць трэба шчыра і сумленна — так, каб, гледзячы на сябе ў люстэрка, не было сорамна.

— Хто гэтыя 138 хлопцаў і дзяўчат, якія ўвайшлі ў другое скліканне Маладзёжнага парламента?

— Маладыя людзі прадстаўляюць кожны рагіён краіны. У Маладзёжны парламент уваходзіць прадстаўнік кожнага раённага цэнтра, горада абласнога падпарадкавання, абласнога цэнтра, дзесяць чалавек дзелегавана ад сталіцы. У асноўным гэта працоўная моладзь. Прысутнічае невялікая колькасць студэнтаў, але і яны працуюць. Сярэдні ўзрост члена Маладзёжнага парламента — 25 гадоў. Пераважная колькасць — гэта дзяўчаты. Маладыя людзі займаюць самыя розныя пасады ў шматлікіх сферах жыццядзейнасці: гэта і рэальны сектар эканомікі, і прамысловасць, і медыцына, і адукацыя, і юрыспрудэнцыя, і ахова правапарадку, і грамадскія арганізацыі. У нашым коле — і дырэктары школ, і прадстаўнікі сілавых структур, і нават дзяржаўныя служачыя... У кожнага з іх — вялікія перспектывы. Нягледзячы на тое што гэтыя людзі вельмі занятыя на сваім асноўным месцы працы, яны знаходзяць час у сваім шчыльным графіку займацца грамадскай работай. У мяне вельмі моцная каманда. Удзячны лёсу, што менавіта гэтае скліканне склалася з людзей, якім можна даверыцца, яны не падвядуць. З гэтымі людзьмі нам рушыць у будучыні па многіх-многіх прыступках. Усяляк стараюся падтрымліваць іх, імкнёмся і па-за парламенцкай работай быць разам. Фарміруем вакол сябе лідараў, разам з імі праводзім мерапрыемствы, каб выяўляць новых.

— Якія задачы вырашаюць маладыя парламентарыі?

— Для мяне, як чалавека, які ўжо быў у Маладзёжным парламенце, вельмі важна не апусціць планку і працягнуць тое, што было пачата першым скліканнем. Традыцыйныя нашы праекты працягваюцца і пашыраюцца. Яны сталі яшчэ лепшымі. Аднак узніклі і новыя праекты. Сярод іх — «Адзіны парламенцкі дзень». Раз на месяц (як правіла, гэта трэці чацвер месяца) члены Маладзёжнага парламента ідуць у школы, каледжы, дзе сустракаюцца з навучэнцамі і расказваюць пра беларускі маладзёжны парламентарызм, як працюць у Маладзёжны парламент і чым ён займаецца. Маладыя людзі даведваюцца, што ёсць грамадска-кансультацыйны савет (куды, дарэчы, яны могуць звярнуцца), які займаецца рэалізацыяй дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Мы разумеем, што парламентарызм — вузкая тэма, не кожны ў ёй разбіраецца. Адным гэта здаецца сумным, іншым, наадварот, праяўляюць цікавасць. Паколькі нас стала амаль удвая больш (было 70, стала 138) і ўжо прадстаўлены кожны раён краіны (гэта была ідэя Наталлі Іванаўны Качанавай), наша задача, каб кожны рэгіён, куды дзелегаваны наш прадстаўнік, працаваў з моладдзю, якая ёсць на месцах. У нас працуюць маладзёжныя саветы (парламенты) пры мясцовых органах улады. Наш прадстаўнік з'яўляецца звяном паміж моладдзю канкрэтнай тэрытарыяльнай адзінкі і рэспубліканскім Маладзёжным парламентам. На гэтых людзях ляжыць вялікая адказнасць, і наша задача — даць ім усе магчымасці і рэсурсы, каб яны добрасумленна працавалі. Калі кожны раён будзе так рэсці сваю дзейнасць у сферы маладзёжнай палітыкі, гэта азначае, што мы справіліся. Прычым не трэба засяроджвацца толькі на сталіцы. Нам трэба ўзмацняць і рэгіёны.

— З першага склікання Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе вы перайшлі на другое, але ўжо ў новым статусе. Наколькі нечаканым было тое, што вас абралі старшынёй гэтага органа?

— Калі старшыняў камісій выбіраюць адкрытым галасаваннем, то старшыню Маладзёжнага парламента і яго намеснікаў — таемным. Канкурэнцыі мне ніхто не склаў: я адзіны, хто захацеў стаць лідарам кансультацыйна-дарадчага органа, таму галасавалі або за маю кандыдатуру, або супраць. Прыемна, што прагаласавалі аднагалосна. Думаю, што ахвотных магло быць больш, калі б не шэраг фактараў. Па-першае, пажадана, каб кіраўнік Маладзёжнага парламента быў з Мінска. І гэта лагічна, інакш ён не зможа паўнавартасна ўзаемадзейнічаць з парламентам. Па-другое, нядзённа, каб старшыня ўжо меў вопыт членства ў Маладзёжным парламенце: ён павінен быць у курсе ўсяго, чым займаецца гэты орган. Кіраўнік павінен захаваць вектар развіцця, пераемнасць традыцый, а не марнавацца час на тое, каб вывучаць абавязкі і паўнамоцтвы Маладзёжнага парламента.

— Наколькі рэальна, што ініцыятывы і прапановы моладзі пачуюць на самым версе?

— Больш чым рэальна. Адразу згадваецца абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, у чым мы з калегамі па Маладзёжным парламенце ў мінулым скліканні прымалі ўдзел. Два нашы прадстаўнікі ўваходзілі ў склад Канстытуцыйнай камісіі. Астатнія прымалі актыўны ўдзел у правядзенні дыялогавых пляцовак, дзе абмяркоўваўся праект абноўленага Асноўнага Закона краіны, уносіліся заўвагі і прапановы. Толькі сёлета Маладзёжна Савет Беларусі правёў звыш 300 дыялогавых пляцовак. Усе прапановы і заўвагі, якія ўносіліся, акумуляваліся і перадаваліся ў наш прэзідыум. У выніку члены Канстытуцыйнай камісіі ад Маладзёжнага парламента мелі магчымасць у мерапрыемствах з удзелам кіраўніка дзяржавы агучыць гэтыя тэзісы, выказацца пра тое, што сёння хвалюе моладзь. Цяпер мы праводзім шэраг праектаў, дзе моладзь мае магчымасць публічна прадэманстраваць свае ініцыятывы. У прыватнасці, гэта тая ж лідарская платформа «Каманда будучыні». Праект, анансаваны на VI Усебеларускім народным сходзе, уключаны ў рэспубліканскі план правядзення мерапрыемстваў па правядзенні Года міру і стваральнай працы, зацверджаны Саўмінам. Пад эгідай Маладзёжнага парламента і Міністэрства аховы здароўя сярод вышэйшых навучальных устаноў медыцынскага профілю краіны другі год запар праходзіць праект «ScienceQuiz». Ад Міністэрства адукацыі мы атрымалі грант на правядзенне 2-га Беларускага маладзёжнага парламенцкага форуму, дзе абмяркуем пытанні, якія сёння хвалююць моладзь. Плануецца, што ў форуме прымуць удзел як члены нашага Маладзёжнага парламента і актыўныя прадстаўнікі ўсіх маладзёжных парламентаў краіны, так і яркія прадстаўнікі нашай моладзі, якія не ўваходзяць у органы маладзёжнага парламентарызму, — усяго каля 160 чалавек.

— Члены Маладзёжнага парламента маюць магчымасць рэгулярна прысутнічаць на пасяджэннях дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, назіраць за дыялогам улады і народа падчас прыёмаў грамадзян. Гэта карысны вопыт для вас?

— Вельмі карысны. Маладыя людзі працуюць у розных сферах, ім важна пачуць ад вышэйшай службовай асобы тое, што іх цікавіць, чым увогуле жыве краіна. Для іх гэта добры досвед. Члены Маладзёжнага парламента напрамую могуць пагутарыць з дэпутатамі і сенатарамі, абмяняцца кантактамі і ў далейшым працаваць разам. У нас ужо ёсць добрыя традыцыі, калі сенатары запрашаюць членаў Маладзёжнага парламента на свае прыёмы, іншыя мерапрыемствы. Маладыя людзі бачаць, як прымаюцца законы, і задумваюцца, ці хацелі б яны самі займацца заканатворчасцю. Увогуле, ганарова прысутнічаць у зале, дзе прымаюцца найважнейшыя для краіны рашэнні. У прысутнасці членаў Маладзёжнага парламента, напрыклад, быў адобраны Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе», уносіліся праўкі ў заканадаўства аб палітычных партыях. У нас ёсць магчымасць прысутнічаць на закрытых экспертных саветах у Савеце Рэспублікі, дзе закранаюцца самыя розныя тэмы.

Фота БелТА

— Неаднарозова даводзілася бачыць вас і вашых калег на асабістых прыёмах грамадзян, якія праводзіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава...

— Асабістыя прыёмы грамадзян — гэта асобны кірунак. Людзі прыходзяць да парламентарыяў з такімі пытаннямі, якія нават нельга прыдумаць. Нават калі ўзяць сто чалавек і кожнаму даручыць прыдумаць пытанне, з якім можна звярнуцца на прыём грамадзян, можа, толькі на 10 працэнтаў мы здагадаемся, якія пытанні хвалююць людзей. Мне давялося прысутнічаць на трох прыёмах грамадзян, якія праводзіла Наталля Качанава. І галоўная выснова: калі б мясцовая ўлада добрасумленна працавала, то большасць пытанняў можна было б вырашыць на месцах. Аднак Наталля Іванаўна прымае ўсіх, выслухоўвае кожнага, хто да яе прыйшоў. Падчас апошняга прыёму яна ўвогуле вяла гутарку з насельніцтвам на працягу 12 гадзін. Прычым выслухала нават тых, хто папярэдне на прыём не запісаўся. Трэба валодаць вялікімі кампетэнцыямі, каб разумець, як вырашыць кожнае пытанне. А апошнія вельмі шмат і ўсе яны — рознага профілю. Ты сядзіш і думаеш: а як бы ты вырашыў тую ці іншую праблему грамадзяніна.

— Нягледзячы на грамадскія пачаткі Маладзёжнага парламента, у яго імкнецца трапіць вялікая колькасць хлопцаў і дзяўчат...

— Можна займацца работай і атрымліваць за гэта грошы, а можна займацца грамадскай работай і атрымліваць тое, чаго не купіш за грошы: давер, імідж, аўтарытэт. Маладзёжны парламент стварае падмурак для далейшага кар'ернага росту. Маладзёжны парламент — гэта як сацыяльны ліфт па лініі парламентарызму. Калі б наш прадстаўнік з першага або з другога скліканні праз пэўны час змог бы трапіць у Нацыянальны сход ужо ў якасці дэпутата, то можна было б з упэўненасцю сказаць, што Маладзёжны парламент стаў той прыступкай, якая паўплывала на кар'ерны рост. Маладзёжны парламент створаны адносна нядаўна, а маладзёжнаму парламентарызму ў нашай краіне — 16 гадоў. Вядома, наш парламент малады, але перспектывы ў яго вялікія. І тое, што нашу работу непасрэдна курыруе Наталля Качанава, сведчыць аб тым, што гэта той самы кадравы рэзерв, тыя маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія могуць гаварыць з уладай напрамую. Галоўнае — не ўпускаць час магчымасцяў, не адседжвацца, а працаваць актыўна і эфектыўна, каб у будучыні стаць маладым лідарам, кіраўніком, чаго нашмат складаней было б дасягнуць без гэтых грамадскіх пачаткаў.

— Добра знаёмыя вы і з журналісцкай прафесіяй. На тэлеканале СТБ ведзяце штотыднёвую аўтарскую праграму «Сенат». Чаму беларусам варта яе глядзець?

— Гэта адзіная праграма, прысвечаная верхняй палаце беларускага парламента. «Сенат» дазваляе акунуцца ў парламенцкую дзейнасць. Праграма — прамы дыялог з членам Савета Рэспублікі. Кожны раз у студыі — новы госць. У адрозненне ад дэпутата Палаты прадстаўнікоў, сенатар мае асноўнае месца работы. Як правіла, ён займае высокую пасаду. Напрыклад, членамі Савета Рэспублікі з'яўляюцца дырэктары «Беларуснафты», «Беларускалію», «Камунаркі»... Кожны госць, які прыходзіць у студыю, можа пракаментаваць тыя ці іншыя пытанні з пазіцыі заканатворцы, і як кіраўнік прадпрыемства або ўстановы. Дзякуючы праграме, можна бліжэй пазнаёміцца са сваім сенатарам, даведацца, што адбываецца ў парламенце і ў цэлым у краіне. Упэўнены, што людзі, якія далёкія ад палітыкі, не ведаюць, чым Палата прадстаўнікоў адрозніваецца ад Савета Рэспублікі, а дэпутат — ад сенатара. Таму наша праграма і для павышэння ўзроўню эрудыцыі, разумення таго, хто будзе прадстаўляць твае законныя інтарэсы на вышэйшым узроўні.

Вераніка КАНЮТА.

Аўдыявэрсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпавednасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ГОДОВОЙ ОТЧЁТ ОАО «МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ» ЗА 2022 ГОД

Месторасположение: 220037, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, тел. +375 17 242-83-12
Количество акционеров: всего – 306, в том числе: юр. лиц – 5, физ. лиц – 301.
Основной вид деятельности – строительство линий электропередач и телекоммуникаций.
Среднесписочная численность работающих – 272 человек, **УНП** – 100068131
Доля государства в уставном фонде (всего, в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	81 263	56,8245
Коммунальная – всего	-	-
В том числе: областная	-	-
районная	-	-
городская	-	-

Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	271	46,1
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	0	46,1
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	1,90	0,32
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги)	X	X	X
типа_____	рублей	-	-
типа_____	рублей	-	-
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	0,00	0,32
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги)	X	X	X
типа_____	рублей	-	-
типа_____	рублей	-	-
Период, за который выплачивались дивиденды	месяц, квартал, год	2022	X
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год	27.03.2023	X
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год	с 26.04.2023 по 23.06.2023, государству по 22.04.2023	X
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	68,61	67,61
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук	-	-
В том числе: поступившие в распоряжение общества	X	X	X
дата зачисления акций на счет «депо» общества / количество акций	штук	срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества	
- / -	-	-	-
приобретенные в целях сокращения общего количества акций:	X	X	X
дата зачисления акций на счет «депо» общества / количество акций	штук	X	X
- / -	-	-	-

Информация о задолженности

Наименование показателя	Ед. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	тыс. руб.	115	177
Просроченная кредиторская задолженность	тыс. руб.	-	-

Отдельные финансовые результаты деятельности

Наименование показателей	Ед. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных обязательных платежей)	тыс. руб.	20 705	17 908
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	тыс. руб.	16 379	13 907
Прибыль (убыток) – всего	тыс. руб.	285	90
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции (работ, услуг)	тыс. руб.	1 940	1 194
прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	тыс. руб.	(405)	(265)
прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	тыс. руб.	(1 402)	(966)
Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	тыс. руб.	253	138
Чистая прибыль	тыс. руб.	285	90
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тыс. руб.	4 254	3 971

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2022 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2022 года	На 31 декабря 2021 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	5 165	5 364
Нематериальные активы	120	4	5
Доходные вложения в материальные активы	130		-
в том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	-	-
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	5	5
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**5 174**	**5 374**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	2 022	1 507
в том числе: материалы	211	1 878	1 446
животные на выращивании и откорме	212		-
незавершенное производство	213	144	61
готовая продукция и товары	214	-	-
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	80	63
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	2 954	2 804
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	1 134	1 231
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**6 190**	**5 605**
БАЛАНС	**300**	**11 364**	**10 979**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	4 505	4 505
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	115	114
Добавочный капитал	450	938	1 078
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	4 254	3 971
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**9 812**	**9 668**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	1 552	1 311
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	586	420
по авансам полученным	632	3	2
по налогам и сборам	633	284	456
по социальному страхованию и обеспечению	634	158	84
по оплате труда	635	444	328
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	77	21
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**1 552**	**1 311**
БАЛАНС	**700**	**11 364**	**10 979**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2022 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2022 года	За январь – декабрь 2021 года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	19 253	15 791
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(15 653)	(13 141)
Валовая прибыль	030	3 600	2 650
Управленческие расходы	040	(1 660)	(1 456)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	1 940	1 194
Прочие доходы по текущей деятельности	070	52	46
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(1 049)	(747)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	943	493
Доходы по инвестиционной деятельности	100	125	95
В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	6	6
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	57	89
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	62	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(235)	-
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(15)	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(220)	-
Доходы по финансовой деятельности	120	20	2
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	20	2
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(315)	(362)
в том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(17)	(3)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(298)	(359)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	(405)	(265)
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	538	228
Налог на прибыль	160	(235)	(119)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(18)	(19)
Чистая прибыль (убыток)	210	285	90
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	(139)	351
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	(1)	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	145	441
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за январь – декабрь 2022 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2022 года	За январь – декабрь 2021 года
Движение денежных средств по текущей деятельности			
Поступило денежных средств – всего	020	24 740	21 789
